

У нашай хаце — свята!

СТАР. 3



Верхні горад не апусцее

СТАР. 5



Развод па-італьянску

СТАР. 7

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

8 ЖНІЎНЯ 2015 г. СУБОТА № 150 (28008) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Актуальна

# ЖЫЛЛЯ БУДУЕЦЦА БОЛЬШ

## Пытанне з «праблемнымі» дамамі сёлета будзе закрыта

**«Кітайцы бязвыплатна збудуюць інтэрнат для нашых студэнтаў, а беларусы пазбавяцца ад усіх «праблемных» дамоў і перавыканаюць план па будаўніцтве жылля прыкладна на 100 тыс. м²», — зазначыў першы намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр КРУЧАНАЎ. Пры гэтым ён падкрэсліў, што нельга рабіць усіх уласнікамі жылля.**

СТАР. 2

### БУДАЎНІЦТВА ЖЫЛЛЯ Ў БЕЛАРУСІ

2010 год — 6 629,9 тыс. кв.м
2011 год — 5 480,1 тыс. кв.м
2012 год — 4 482,8 тыс. кв.м
2013 год — 5 220,4 тыс. кв.м
2014 год — 5 523,1 тыс. кв.м

У I паўгоддзі 2015 года ў Беларусі ўведзена ў эксплуатацыю 2 747,8 тыс. кв.м жылля, што на 1,4% больш за ўзровень I паўгоддзя 2014 года:




На будаўніцтва жылля выкарыстана Br20,5 трлн інвестыцый у асноўны капітал.

АСНОЎНЫЯ КРЫНІЦЫ ЎВОДУ Ў ЭКСПЛУАТАЦЫЮ ЖЫЛЛЯ:

60,3% — уласныя сродкі насельніцтва
25,1% — крэдыты (пазыкі) банкаў

Крыніца: Белстат. © Инфаграфіка БЕЛТА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ «Спякотны» рэпартаж

# ФАНТАНЫ ТАКСАМА ХОЧУЦЬ ПІЦЬ

**Распалены ад пякучага сонца асфальт не паспявае астываць нават за ноч. Раніца прыносіць невялікую палёгку, але хутка паветра зноў напаўняецца цяжкімі пахамі нагрэтага бетону і становіцца цяжка дыхаць.**

У Магілёве ёсць ужо і першыя пацярпелыя ад бязлітаснай спёкі. За апошнія тры дні медыкі гарадской станцыі хуткай дапамогі пяць разоў выязджалі менавіта на такія сігналы. Сярод пацярпелых адзін жыхар вёскі, астатнія магілеўчане. Дапамогу аказвалі ў асноўным на месцы, але адну дзяўчынку прыйшлося завесці нават у бальніцу.

— Калі ёсць магчымасць у самую спёку з 12.00 да 14.00 не выходзіць з дому, не рызыкуйце, — раіць урач гарадской станцыі хуткай дапамогі Леанід Казак. — Усім астатнім не будзе лішнім прыхапіць з сабой ваду і валідол. Стане лягчэй, нават калі проста змочваць вадой лоб і грудзі. А вось ад газіроўкі лепей адмовіцца. Гэта дадатковая нагрузка на ўнутраныя органы і асабліва сэрца.

Медыкі заклікаюць быць больш уважлівымі да сябе гіпертонікаў. І нават калі ціск у норме, не адмаўляцца ад прыёму лекаў. Трэба, каб іх канцэнтрацыя ў крыві заставалася пастаяннай.

Вось дзе рай сёння, дык гэта на Магілёўскай фабрыцы марожанага. У памяшканнях, дзе захоўваецца самы запатрабаваны зараз прадукт, мінус 20-25! Попыт на марожанае ў спякотныя дні падскоквае аж у тры разы. Толькі за дзень фабрыка рэалізуе каля 15 тон салодкай прахалоды. Вытворцы не губляюць марна час, праводзяць акцыі і робяць зніжкі. І калі ў звычайныя дні народ не вельмі спяшаецца аддаць у сярэднім 10 тысяч за ледзяны ласунак, то пры такіх спрыяльных абставінах рука сама цягнецца па кашалёк.

Не меншым попытам карыстаецца квас. Я таксама набываю за 2500 рублёў маленькую шкляначку. «Што за добрае надвор'е!» — радуецца гандлярка, ветліва ўсміхаючыся стомленым ад спёкі пакупнікам. Прызнаецца, што самы пік продажу — гэта поўдзень. А вось пасля абеду гандаль крыху спыняецца.

У пошуках ратунку ад спёкі іду да фантанаў і вачам сваім не веру. Яны таксама хочуць піць. Металічныя трубы, з якіх павінны біць жыватворныя струменьчыкі, сухія. І толькі ўнізе пад імі пазелянелая на сонцы вада. Птушкам дастаткова і гэтага. Купаюцца сабе, усім на зайздрасць. У спадзяванні пасядзець пад ахалоджваючымі пырскамі накіроўваюся ў сквер 40-годдзя Перамогі. Там ужо дакладна фантаны павінны біць. Але ўсё дарэмна: і там суха. «Напэўна, ваду эканомяць, — пацiснула плячыма дзяўчына, якая адзінока сядзела на бетонным парапеце. — Апошні раз 2 жніўня ўключалі, у Дзень дэсантніка». Дзяўчына не памылілася, у «Гарводаканале» яе здагадку пацвердзілі. На маё пытанне там толькі цяжка ўздыхнулі, маўляў, на ўсім сёння прыходзіцца эканоміць. І выказалі думку, што дастаткова ўключаць фантаны па выхадных днях. Вось толькі чаму гэтая спякота турбуе нас і ў працоўныя дні?

На шчасце, дарожна-маставое прадпрыемства на вадзе не эканоміць. У дзень вуліцы Магілёва палівае ад 6 да 8 машын, на гарачы асфальт выліваецца да 600 кубаметраў вільгаці, якая, дарэчы, бярэцца з Дняпра. Яшчэ некалькі машын ДМП арандуе Магілёўзеляндбуд — ратуе ад высыхання кветнікі і зялёныя насаджэнні.

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр:**

*«Рэальная зарплата ў краіне па выніках гэтага года будзе не ніжэйшая за мінулагодні ўзровень. Пакуль што яна некалькі ніжэйшая, але выразна абазначылася тэндэнцыя па скарачэнні гэтага адставання. Калі на пачатак года рэальная зарплата складала 96% з невялікім, то цяпер ужо 98%. Мы разлічваем, што ў выніку яна будзе не ніжэйшай за 100%. Для гэтага, нягледзячы на няпростыя з'явы ў сусветнай і ўнутранай эканоміцы, ёсць падставы. Так, у нас склаўся значны прафіцыт бюджэту, сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі па выніках пяці месяцаў было станоўчым і склала $675 млн.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 08.08.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15690,00 | ▼ |
| Еўра | 17149,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 245,54 | ▼ |
| Укр. грыўня | 743,60 | ▲ |

■ Кампетэнтна

# Выбары — гэта момант ісціны,
## у тым ліку і для СМІ

**Патэнцыял нацыянальнай інфармацыйнай прасторы дазваляе ў поўнай меры забяспечыць шырокае і ўсебаковае інфармаванне насельніцтва аб ходзе выбарчай кампаніі. Пра гэта ў інтэрв'ю інфармацыйнаму агенцтву БЕЛТА расказала міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ.**



Фота Надзеі БУЖАН.

***— Лілія Станіславаўна, пастановай Цэнтрвыбаркама зацверджана Палажэнне аб парадку выкарыстання сродкаў масавай інфармацыі пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў Прэзідэнта Беларусі ў 2015 годзе. Сродкі масавай інфармацыі закліканы забяспечыць роўныя магчымасці для кандыдатаў у Прэзідэнты, галоснае і адкрытае правядзенне ўсіх этапаў выбарчай кампаніі. Як вы ацэньваеце патэнцыял беларускіх СМІ ў гэтым кантэксце?***

— У краіне створана канкурэнтная інфармацыйная прастора, якая дынамічна развіваецца. У нас зарэгістравана 1577 друкаваных СМІ, 273 электронныя, 9 інфармацыйных агенцтваў. Пры гэтым 2/3 усіх беларускіх сродкаў масавай інфармацыі з'яўляюцца недзяржаўнымі.

Акрамя таго, на тэрыторыі Беларусі распаўсюджваецца больш за 4 тысячы замежных друкаваных СМІ з Расіі, Украіны, Казахстана, ЗША, Вялікабрытаніі, Германіі, Францыі, Італіі, Нідэрландаў, Літвы, Польшчы, Латвіі, Фінляндыі. Атрымалі дазвол на распаўсюджванне і трансліруюцца больш за 200 замежных тэлеканалаў.

У Беларусі актыўна ўкараняюцца інтэрнэт-тэлебачанне, IP, OTT, SMART-тэхналогіі. Цалкам завершаны пераход у лічбавы фармат эфірнага тэлевяшчання ў дэцыметровым дыяпазоне. Тэлевізійная аўдыторыя апаратаў электрасувязі перавышае 6 млн чалавек.

Сегментам медыйнага поля, які найбольш дынамічна развіваецца, з'яўляецца інтэрнэт. У краіне больш за 5 млн карыстальнікаў інтэрнэту. У рэйтынгу Міжнароднага саюза электрасувязі мы займаем 38-е месца, апярэджваючы такія краіны, як Расія, Казахстан, Літва, Польшча, Балгарыя, Румынія, Венгрыя, Грэцыя, Славакія, Партугалія, Аргенціна, Турцыя і іншыя.

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Грэцыя выплаціла МВФ 186 мільёнаў еўра



Грэцыя пераявяла Міжнароднаму валютнаму фонду чарговы транш выплат па дзяржпаўгу ў памеры 186,3 мільёна еўра. У дзень выплаты — 6 жніўня — прэм'ер-міністр Грэцыі Алексіс Цыпрас і прэзідэнт Францыі Франсуа Аланд заявілі, што новы пакет дапамогі Афінам плануецца ўзгадніць да канца жніўня. У канцы ліпеня МВФ прыняў рашэнне не выдаваць Грэцыі новых крэдытаў, увязаўшы іх прадастаўленне з рэформамі эканомікі краіны, а таксама з вылучэннем пакета фінансавай дапамогі з боку еўразоны. На пасяджэнні праўлення фонду 29 ліпеня было адзначана, што ў Грэцыі занадта высокі ўзровень доўгу, а ранейшыя абяцанні аб правядзенні рэформаў Афіны так і не выканалі. У сярэдзіне ліпеня Грэцыя папярэдне дамовілася з Еўрасаюзам аб новым пакеце фінансавай дапамогі на 86 мільярдаў еўра. Умовай для пачатку перамоваў было прыняцце серыі законаў аб узмацненні мер эканоміі. Наступны плацеж па абавязку перад Еўрапейскім цэнтральным банкам Афінам трэба зрабіць 20 жніўня.

### КНДР створыць уласны часавы пояс

Улады Паўночнай Карэі абвясцілі аб стварэнні ўласнага часавага пояса. У адпаведнасці з рашэннем Вярхоўнага народнага схода КНДР, пачынаючы з 15 жніўня краіна будзе жыць па новым часе — стрэлкі гадзіннікаў перавядуць на 30 хвілін назад. Такім чынам Паўночная Карэя апынецца паміж двума часавымі паясамі, у якіх жывуць Японія (GMT + 9:00) і Кітай (GMT + 8:00). Змена прымеркавана да 70-годдзя вызвалення Карэі ад японскай акупацыі. У Сеуле планы Пхеньяна раскрытыкавалі: па словах афіцыйнага прадстаўніка паўднёвакарэйскага міністэрства па справах аб'яднання, змена часавага пояса ў КНДР можа негатыўна адбіцца на працы індустрыяльнага комплексу «Кэсан», а ў будучыні і на працэсах міжкарэйскай інтэграцыі ўвогуле. Паўднёвая Карэя працягне жыць у адным часавым поясе з Японіяй, паколькі пераход на іншы час можа пацягнуць сур'ёзныя эканамічныя праблемы.

### Баевікі Ісламскай дзяржавы выкралі ў Сірыі 230 чалавек

По словах праваабаронцаў, у палон былі ўзяты жыхары горада Эль-Кар'ятэйн, размешчанага ў правінцыі Хомс. Некаторыя з іх у момант нападу знаходзіліся ў царкве. У сераду, 7 жніўня, Эль-Кар'ятэйн перайшоў пад кантроль ісламістаў. Паведамляецца, што раней многія хрысціяне, ратуючыся ад баевікоў Ісламскай дзяржавы, беглі ў гэты горад з захопленай ісламістамі правінцыі Алепо. Як распавёў Рамі Абдэль Рахман, баевікі захапілі тых, хто, на іх думку, «супрацоўнічаў з рэжымам».

ISSN 1990 - 763X
9 771990 763008 15150

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Ва Украіне ўступіў у сілу закон аб мясцовых выбарах

Закон «Аб мясцовых выбарах» уступіў у дзеянне на тэрыторыі Украіны. Яго тэкст апублікавала друкаванае выданне Вярхоўнай Рады.

Старт выбарчай кампаніі будзе дадзены 5 верасня, за 50 дзён да пачатку галасавання, якое адбудзецца 25 кастрычніка. У мясцовых выбарах змогуць прыняць удзел тыя палітычныя партыі, якія былі зарэгістраваны на момант апублікавання закона. Выбарчыя блокі партый пазбаўлены права на ўдзел у выбарах. Таксама, у параўнанні з выбарамі 2010 года, да пяці працэнтаў павялічыўся прахадны бар'ер для партый, якія раней складаў тры працэнты.

Выбары ў мясцовыя Саветы Крыма, а таксама на частцы тэрыторыі Данецкай і Луганскай абласцей праводзіцца не будуць.

■ Дзякуй

# ЖЫВІ, «ЗВЯЗДА», ДА СТА І ДАЛЕЙ!..

**Калі вы думаеце, што ў латарэі, якую перыядычна ладзіць газета, выйграць складана, то вельмі памыляецеся.**

*«Я выпісваю «Звязду» ўжо некалькі дзесяцігоддзяў і, зразумела ж, не для таго, каб атрымліваць нейкія прызы. «Звязда» — наша гісторыя, наша родная мова, тут заўсёды ёсць што пачытаць. А калі, апроч гэтага, з'яўляецца магчымасць выйграць, то чаму б не паспрабаваць: купоны ў газеце друкуюцца, адрас рэдакцыі вядомы — Мінск, вуліца Хмяльніцкага, 10А...*

*Карацей, аформіўшы падпіску, я кожны раз адсылаў сваю картку — браў удзел у латарэі...*

*І, ведаеце, мне пашчасціла! Не так даўно адмыкаю паштовую скрынку, бачу там чаканыя нумары газеты і... досыць нечаканы канверт. А ў ім — ліст з рэдакцыі, дзе напісана, што па выніках розыгрышу прызавога фонду рэкламнай гульні «Са «Звяздою» — лета ў радасць!» я выйграў падвеснае крэсла-гамак CARINA!*

*Шчыра скажу: рады быў бязмерна!..*

*Не адкладваючы на потым, завітаў у рэдакцыю, атрымаў падарунак і, паколькі сам да гамакоў неяк не прывучаны, перадаў тое крэсла ўнучцы Настачцы. Так што шчыры дзякуй, «Звязда»! Яшчэ і ад яе...*

**Уладзімір ШУЛЯКОЎСКІ,**
*г. Мінск»*



**Ад рэдакцыі.** Не будзем казаць «няма за што», бо ў гэтым выпадку, здаецца, ёсць.

Без звычнага «Калі ласка!» можна абысціся таксама. Нельга — асабліва сёння, напярэдадні дня народзінаў «Звязды» — без слоў удзячнасці ўсім нашым чытачам і падпісчыкам за іх выбар, за давер, за падтрымку. Са святам нас: 98 гадоў газеце — гэта, пагадзіцеся, паважаны ўзрост і вельмі прыгожая дата!

Што да перадачы прызоў... Рэдакцыі добра вядома, што яны, звяздоўскія, досыць часта і, так бы мовіць, эстафетай, перадаюцца ад аднаго чалавека — іншаму: права падпісчыкаў распараджацца імі на свой погляд.

Наша права — хіба памарыць, што разам з прызамі (альбо і без...) ад нашых чытачоў да іх дзяцей і ўнукаў эстафетай перадасца яшчэ і любоў — да роднай мовы, да найстарэйшай беларускай газеты.

Толькі тады ёй жыць. Да ста... І далей!

**P.S.** Калі вярстаўся нумар, пошта прынесла віншаванне:

*Творцам любае «Звязды»*
*Моцы, грошай і ўдачы!*
*Так трымаць! І не іначай,*
*Каб яшчэ гады й гады*
*Край квітнеў —*
*не без «Звязды»!*

**Віталь ГЕРАСІМАЎ,**
*г. Мінск.*

# Выбары — гэта момант ісціны

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У нас адкрытая, дынамічная нацыянальная інфармацыйная прастора, і яе патэнцыял у поўнай меры дазваляе забяспечыць шырокае і ўсебаковае інфармаванне насельніцтва аб ходзе выбарчай кампаніі, данесці праграмныя палажэнні кандыдатаў, безумоўна, пасля іх рэгістрацыі ў гэтай якасці ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку.

Хоць з аналізу публікуемай зараз інфармацыі відаць, што асобныя ангажыраваныя СМІ і палітычныя сілы, якія стаяць за імі, аддаюць перавагу заклікам да байкоту або спрабуюць надаць сур'ёзнай грамадска-палітычнай кампаніі карыкатурны характар.

Безумоўна, такія публікацыі не могуць прэтэндаваць на аб'ектыўнасць і транспарэнтнасць.

Бываючы ў рэгіёнах, сустракаючыся з людзьмі ў працоўных калектывах, аналізуючы звароты грамадзян у сродкі масавай інфармацыі, мы бачым, што людзі неабыякавыя да будучыні краіны і гатовы прадэманстраваць сваё стаўленне актыўным удзелам у выбарчай кампаніі. Што ўласна і паказвае перыяд збору подпісаў за патэнцыйных кандыдатаў.

Нягледзячы на складанасці сучаснага перыяду, беларусы ў поўнай меры разумеюць, што паспяховая будучыня не можа быць прыўнесена звонку і толькі разам, карпатлівай стваральнай працай будуецца паспяховая краіна.

Мы ўжо даўно прызвычаіліся да спакойнага жыцця, прыгожых, дагледжаных вуліц гарадоў і вёсак. Дасягненні апошняга дваццацігоддзя для ўсіх відавочныя. Як бы ні было цяжка, мы захавалі і развілі прамысловы патэнцыял, стварылі экспартна арыентаваную сельскую гаспадарку, пабудавалі тысячы аб'ектаў сацыяльна-культурнай сферы. У краіне з'явіліся цэлыя галіны, заснаваныя на новых тэхналогіях. Мы не перапісвалі нашу гісторыю, захавалі ўсё найлепшае, створанае папярэднімі пакаленнямі.

І таму ўсе, хто прыязджае да нас, захапляюцца нашай краінай, адзначаюць шчырасць, міралюбнасць і гасціннасць беларускага народа. А ўсё гэта не дадзена звыш, гэта зрабілі мы — беларусы.

***— Знакавыя палітычныя падзеі накладаюць на журналістаў асаблівую адказнасць. І прафесійную, і грамадзянскую. На ваш погляд, ці ёсць сёння ва ўсіх СМІ, інтэрнэт-рэсурсаў такое разуменне сваёй адказнасці?***

— Хачу адзначыць: найважнейшая грамадска-палітычная кампанія не адмяняе патрабаванняў заканадаўства да сродкаў масавай інфармацыі. Яны абавязаны выконваць яго з мэтай найбольш поўнага, аб'ектыўнага інфармавання грамадзян аб сутнасці працэсаў, якія адбываюцца.

На дадзеным этапе Міністэрства інфармацыі, як рэгулятар галіны, уважліва аналізуе інфармацыйныя патокі, пры гэтым адзначаючы, што дзяржаўныя СМІ, якія, дарэчы, пералічаны і ў пастанове Цэнтрвыбаркама, у поўным аб'ёме выконваюць ускладзеныя на іх функцыі інфармавання. Разам з тым, пастанова не рэгламентуе дзейнасць усіх СМІ. Хутчэй, гэта адказнасць тых, хто вызначае іх рэдакцыйную палітыку. Безумоўна, мы будзем не толькі ўважліва адсочваць выкананне заканадаўства, але і ў выпадках відавочнага яго парушэння адэкватна рэагаваць.

Выбары — гэта момант ісціны, у тым ліку для СМІ. Палітычная кан'юнктура, заангажаванасць наўрад ці могуць служыць вернымі арыенцірамі для журналістаў. Самая галоўная і найлепшая мэта — служыць сваёй краіне і свайму народу.

# ЖЫЛЛЯ БУДУЕЦЦА БОЛЬШ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

*— Асноўныя задачы будаўнічага комплексу зараз — стрымліваць рост кошту будаўніцтва і не дапускаць празмернасцей, улічваючы зніжэнне аб'ёму інвестыцый, каб дасягнуць суадносін якасці і кошту, — падкрэсліў намеснік міністра. — Работа гэтая вядзецца па ўсіх накірунках. Штогадовы эканамічны эфект ад укаранення ў вытворчасць завершаных распрацовак у галіне будаўніцтва складае не менш за 8 рублёў на 1 рубель выдаткаў на навуку. Уведзены 157 тэхнічных нарматыўна-прававых актаў (ТНПА), з якіх 75 — ідэнтычныя еўрапейскім, а 39 нашых будаўнічых матэрыялаў маюць маркіроўку Еўрапейскага саюза.*

## ЖЫЛЛЁВЫЯ І АРЭНДНЫЯ «МЕТРЫ»

Нягледзячы на змяншэнне аб'ёму інвестыцый, жыллёвае будаўніцтва ў гэтым годзе вядзецца хуткімі тэмпамі. За першае паўгоддзе ўзведзена 2 млн 747,8 тысячы $м^2$ (або 68,7% замест запланаваных на гэты тэрмін 50%). Улічваючы такія тэмпы, да канца 2015-га замест запланаваных 4 млн м будзе збудавана 4 млн 110 тысяч. Лідзіруе ў гэтым сэнсе Брэсцкая вобласць, дзе ўжо зараз план жыллёвага будаўніцтва на гэты год выкананы на 102%.

**Будаўнічы комплекс Беларусі змяшчае 13 000 суб'ектаў гаспадарання: будаўнічыя трэсты, прадпрыемствы будаўнічай індустрыі, праектныя і навукова-даследчыя ўстановы і г.д., дзе працуе каля 250 000 чалавек з сярэдняй зарплатай крыху большай за 8 млн рублёў. Па выніках паўгоддзя ўдзельная вага будаўніцтва ў складзе ВУП — 8,2%.**

57,4% ад задання на год (905 тысяч $м^2$) збудавана з дзяржпадтрымкай, да канца года гэты паказчык плануецца давесці да 103,5%. Кошт квадратнага метра пры гэтым складае 6 млн 971 тысяча рублёў. Для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, узведзена 1 млн 115 тысяч $м^2$. Адзін метр такога жылля каштуе зараз у сярэднім па рэспубліцы 7 млн 220 тысяч рублёў.

У 5,7 раза павялічыўся аб'ём будаўніцтва жылля па дзяржаўным заказе і склаў 325 тысяч $м^2$. Тэмпы будаўніцтва арэнднага жылля таксама павышаюцца — за паўгода ўжо ўведзена 118 тысяч $м^2$.

## УПОР — НА ЭКАНОМКЛАС

*— Пры гэтым мы вельмі абмежаваны ў аб'ёмах сродкаў крэдытавання. 6,1 млн інвестыцый распісаны па кожным доме канкрэтна, і ўсім даводзіцца ўпісвацца ў гэтыя сродкі, — дадаў Аляксандр Кручанаў. — На 2016 год зноў запланавана будаўніцтва 4 млн $м^2$, з якіх 1 млн 580 тысяч — жыллё з дзяржпадтрымкай, на што, магчыма, будзе выдаткавана 7 трлн рублёў (пакуль бюджэт не сфарміраваны), так што паляпшэння ў інвестыцыйным кірунку пакуль не назіраецца.*

У такіх умовах будаўнікі робяць упор на жыллё эканомкласа, узвядзеннем якога займаюцца домабудаўнічыя камбінаты, пра якія пойдзе гаворка ва ўказе №26. Гэтым прадпрыемствам прапануецца даць магчымасць набываць зямельныя ўчасткі для будаўніцтва жылля грамадзянам, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, без удзелу ў конкурсе.

*— Такім чынам мы і жыллёвае пытанне вырашым, і загрузім працай камбінаты, якія ў нас зараз мадэрнізаваны настолькі, што нават з-за мяжы прыязджаюць на іх паглядзець, — распавёў намеснік міністра.*

## НА КАНТРОЛІ ДЗЯРЖАВЫ

Іншыя крыніцы фінансавання будаўніцтва жылля — іпатэка і выкарыстанне жыллёвых зберажэнняў грамадзян, якія павінны былі апрабавацца ў гэтым годзе, — працаваць пакуль не могуць з прычыны высокай стаўкі рэфінансавання. Разам з тым, у гэтым паўгоддзі значна павялічыўся аб'ём будаўніцтва з прыцягненнем уласных сродкаў грамадзян, пры гэтым крыху паменшыўся кошт на першасным (каля 10 млн за $м^2$) і другасным (15 млн за $м^2$) рынках жылля.

Намеснік міністра падкрэсліў, што кожны «праблемны» дом (з ненарматыўным тэрмінам будаўніцтва) знаходзіцца на кантролі дзяржавы, і прывёў лічбы на 31 ліпеня. У Віцебскай вобласці застаўся адзін такі будынак, які гатовы на 83% праз неўкамплектаванасць дольшчыкамі — праблему плануюць вырашыць у верасні. У Мінску — 14 аб'ектаў, 6 з якіх ужо падрыхтаваны да здачы, астатнія здадуць у жніўні і верасні. «Гэты год стане пераломным, бо мы закрыем пытанне «праблемных» дамоў», — упэўнены прадстаўнік міністэрства.

## ЦЭМЕНТ — ПА-МАКСІМУМЕ

На будаўнічых прадпрыемствах праводзіцца праграма па зніжэнні сабекошту прадукцыі і аптымізацыі структуры затрат на вытворчасць, у межах якой у краіне мадэрнізаваны тры цэментныя заводы. Іх магутнасць планавалася ў памеры да 9,5 млн тон (кіруючыся планам збудавання 10 млн $м^2$ жылля ў год). Улічваючы памяншэнне колькасці планавых метраў да 4 млн, выбраны кірунак на стварэнне новых будаўнічых матэрыялаў з максімальным выкарыстаннем цэменту як асноўнага складніку.

*— У нас шмат напрацовак: плітка са штучнага каменю, будаўніцтва бетонных дарог і іншае. Эканамічны эфект ужо дасягаецца падчас рамонтных работ на Мінскай кальцавой дарозе, дзе за суткі ўкладваецца адзін кіламетр «бетонкі», тэрмін службы якой 25 гадоў супраць 12,5 года прыдатнасці асфальтавага пакрыцця, — распавёў Аляксандр Кручанаў. — Кітайскі бок акажа тэхнічную бязвыплатную падтрымку ў будаўніцтве сацыяльнага жылля, за кошт чаго запланавана будаўніцтва 39 аб'ектаў па ўсіх абласцях. Будзе ўзведзены таксама інтэрнат для студэнтаў, на што выдаткоўваецца 100 млн юаняў.*

**Ірына СІДАРОК.**

■ Май на ўвазе!

## У ЛЯСЫ — НІ КРОКУ!

З мэтамі папярэджвання ўзнікнення лясных пажараў і прадухілення ўскладнення становішча ва ўсіх раёнах краіны ўведзена забарона на наведванне лясоў, пра што паведамілі ў Міністэрстве лясной гаспадаркі. У перыяд забароны закрываюцца ўсе шлагбаумы на з'ездах з дарог ва ўгоддзі. Самастойна адкрываць апушчаныя шлагбаумы забараняецца. На аўтатранспарце можна праязджаць толькі па дарогах, якія вядуць да населеных пунктаў, а таксама ўладкаваных месцаў адпачынку. Распальваць вогнішчы ў лясах і на тарфяніках таксама нельга. Забараняецца ўезд на ўсе лясныя дарогі (за выключэннем дарог агульнага карыстання, якія праходзяць праз лясныя масівы).

## НЕ СТОЙЦЕ ПАД СОНЦАМ

У сталіцы абмяжоўваецца правядзенне масавых мерапрыемстваў на адкрытых тэрыторыях. У выпадку, калі яны ўсё ж павінны адбыцца, гэтыя месцы патрэбна забяспечыць бутыляванай вадой у неабходнай колькасці. Але найлепш па магчымасці адмяніць такія мерапрыемствы ўвогуле. Такое рашэнне прыняла камісія па надзвычайных сітуацыях, пасяджэнне якой адбылося ў Мінскім гарадскім выканаўчым камітэце. Прадугледжана выключэнне выкарыстання на тэрыторыі Мінска адкрытага агню і піратэхнічных вырабаў. Галоўнаму санітарнаму ўрачу сталіцы даручана забяспечыць маніторынг якасці вады ў вадаёмах горада.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

20 августа 2015 г. в 10.00. состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Лорри-Сервис».

Повестка дня:

1. Об утверждении разделительного баланса.
2. Об изменении размера уставного фонда ОАО «Лорри-Сервис».
3. О внесении и утверждении изменений в Устав Общества.

Местонахождение ОАО «Лорри-Сервис»: г. Брест, ул. Дубровская, 36.
Место проведения собрания: г. Брест, ул. Дубровская, 36.
Время регистрации в день проведения собрания с 09.30 до 10.00.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни с 12.08.2015 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества. Совет директоров.

УНН 200246280

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, офис 1703 |
| Продавец | ОАО «Речицкий текстиль», г. Речица, Гомельская область, ул. Наумова, 131 |

**Предмет повторного аукциона**
**Объекты недвижимого имущества, расположенные по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Комсомольская, 2:**

| Наименование | Назначение | Общая площадь, кв. м | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Ткацкий цех №1** | Здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий | 1240,5 | 311/С – 30576 |
| **Склад химикатов** | Здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий | 118,8 | 311/С- 30578 |
| **Администра-тивное здание** | Здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий | 383,5 | 311/С- 30581 |
| Обременения | Площади здания частично обременены договорами аренды. | | |
| **Цех ОТК** | Здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий | 954,3 | 311/С- 30582 |
| Обременения | Площади здания частично обременены договорами аренды. | | |
| **Склад** | Здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий | 19,6 | 311/С- 30584 |
| **Трансформа-торная под-станция** | Здание специализированное энергетики | 41,1 | 311/С- 30585 |
| Составные части и принадлежности: | Пять металлических емкостей. | | |
| **Насосная** | Здание специализированное коммунального хозяйства | 26,5 | 311/С- 30586 |
| **Здание красильного цеха** | Здание красильного цеха | 595,7 | 311/С- 30596 |
| **Здание котельной** | Здание котельной | 317,4 | 311/С- 30597 |
| Составные части и принадлежности: | Металлическая труба. | | |
| **Центральное отопление инв. № 176** | Сооружение специализированное энергетики | 444,65 м | 311/С-46243 |
| Составные части и принадлежности: | Три колодца. | | |
| **Канализаци-онная система инв. № 377** | Сооружение специализированное коммунального хозяйства | 249,96 м | 311/С-46244 |
| Составные части и принадлежности: | Девять колодцев. | | |
| Благоустройство | Сооружение неустановленного назначения | - | 311/С-46537 |
| Составные части и принадлежности: | Сооружение благоустройства, состоящее из асфальтобетонного покрытия площадью 4559 кв.м, железобетонного водоема и железобетонного водоема пожарного. | | |
| Сведения о земельном участке: | пл. 2.0517 предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для размещения объектов обрабатывающей промышленности с установленными ограничениями (водоохранная зона водных объектов) | | |

**В том числе:**
- линия электропередач (алюминиевая в оболочке в земле инв.№367)
- забор желефзобетонный (инв.№712)
- забор железобетонный (инв.№715)

| Наименование | Инвентарный номер | Наименование | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| Котел паровой | №289192 | Подогреватель пароводяной ПП2-9-7-4 | №714 |
| Котел паровой Е 1-9 | №28919 | Насос ВК1/16 (центробежный) | №54 |
| Электродвигатель | №531 | Насос | №5270 |
| Электродвигатель | №532 | Насос центробежный | №529 |
| Электродвигатель | №2024 | Насос КС12/50 | №530 |
| Электродвигатель | №2025 | Насос подпиточный | №612 |
| Химводочистка | №14 | Насосная установка к28/500 | №713 |
| Водонагреватель | №3899 | Дымосос ДН-3 | №53 |
| Водонагреватель | №5877 | Дымосос | №55 |
| Водонагреватель-ная установка | №289188 | Вентилятор ЦУ-70 | №425 |
| Охладитель | №289189 | ГРУ (газово-распределительный узел) | №291 |
| Колонка ДА-5 | №289140 | Вентиляционная камера | №57 |
| Охладитель | №289191 | Вентилятор ВЦП-8 | №423 |
| Водонагреватель | №10035 | Лифт грузовой грузоп. 500 кг | №35 |

***Начальная цена с НДС 20 % – 1 093 688 880 белорусских рублей.***

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

| | |
|---|---|
| Срок подписания договора купли-продажи: | 15 рабочих дней после проведения аукциона. |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи. Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by. | |
| *Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 26.06.2015 г.* | |
| Дата и время проведения аукциона | 09.09.2015 в 14ч.00 мин по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки». |
| Дата и время окончания приема документов | 07.09.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки». |
| Контактные данные | **Тел. +375-17-280-36-37, +375-29-183-69-71,** Email: auction@cpo.by, www.cpo.by. |

■ Добрая навіна

# ЧАТЫРЫ ДЗІЦЯЧЫЯ ДАМЫ СЯМЕЙНАГА ТЫПУ

## будуць уведзены ў эксплуатацыю ў Брэсцкай вобласці да канца года

**Людміла КАСЦЮК, загадчыца сектара аховы дзяцінства ўпраўлення адукацыі Брэсцкага аблвыканкама, адзначыла, што гэтыя дамы ўводзяцца ў Брэсце, Івацэвічах, Высокім (Камянецкі раён) і ў гарадскім пасёлку Лагішын (Пінскі раён). З рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў на іх будаўніцтва выдзелена амаль Br4 млрд. Ужо цяпер вядзецца падбор бацькоў-выхавальнікаў.**

У прыватнасці, новы дзіцячы дом сямейнага тыпу будуецца ў Брэсце па вуліцы Васняцова. Яго здача ў эксплуатацыю намечана на лістапад-снежань гэтага года. Плануецца, што бацькі з дзецьмі адзначаць наваселле ў пачатку 2016-га. У аддзел адукацыі адміністрацыі Маскоўскага раёна ўжо паступіла тры заявы ад сямейных пар, якія жадаюць падарыць сіротам бацькоўскае цяпло і ласку.

«Пары пройдуць псіхалагічную гутарку, прафесійную падрыхтоўку. Калі на гэтым этапе ніхто не сыдзе з дыстанцыі, будзе праводзіцца конкурсны адбор. Але ў любым выпадку, калі кандыдаты сябе зарэкамендуе са станоўчага боку, яны не застануцца без працы. Іх у далейшым працаўладкуюць у іншых дамах сямейнага тыпу», — падкрэсліла **метадыст аддзела адукацыі, спорту і турызму адміністрацыі Маскоўскага раёна Брэста Юлія ПАРАФЯНЮК**. У Брэсцкай вобласці зараз налічваецца 38 дамоў сямейнага тыпу, у якіх выхоўваецца 251 дзіця з ліку дзяцей-сірот. Таксама ў рэгіёне функцыянуюць тры дзіцячыя дамы ў Кобрыне, Івацэвіцкім і Кобрынскім раёнах. Там пражываюць 216 дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў.

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ**

# ФАНТАНЫ ТАКСАМА ХОЧУЦЬ ПІЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Спякота стварыла напружанае становішча і ў лясах. За ўсё лета, здаецца, было толькі некалькі тыдняў, калі яны адкрываліся для наведвання. З учарашняга дня ва ўсёй Магілёўскай вобласці яны зноў закрытыя. «Не ад добрага жыцця гэта робіцца, — тлумачыць **інжынер па ахове лесу Магілёўскага абласнога лесагаспадарчага аб'яднання Міхаіл ДЗЯРУГІН**. — Вунь у Асіповіцкім раёне некалькі дзён запар палала. Не паверыце, але ёсць людзі, якія зусім не разумеюць, што ў такую спёку нельга вогнішчы раскладаць. Звычайна першы раз мы парушальнікаў папярэджваем, але ёсць такія, што нічога разумець не жадаюць. Даводзіцца прымяняць больш жорсткія меры — штрафаваць. З пачатку года пакарана ўжо болей за 70 чалавек. З іх каля 50 за два летнія месяцы — ігнаравалі забарону».

Для тых, хто жыве за кошт лясных дароў, спёка — самае жорсткае пакаранне. Лес на замку, але яны рызыкуюць. Зранку на Цэнтральным рынку Магілёва сядзяць гандляры вітаміннай прадукцыі, у тым ліку і лясной. Літровы слоік чарніц прапануюць за 20 тысяч рублёў. На пытанне «адкуль?» жанчына бянтэжыць: «З Асіповіцкага раёна!» Раён, вядомая справа, чысты, але ж там лес гарыць. «Так, — пагаджаецца кабета. — У нас каля дома таксама дымам пахне. Толькі ягады — гэта адзіны мой заробак. Была апякункай сваёй маці, але яна нядаўна памерла. Мне ж да пенсіі год застаўся, таму ўладкавацца на працу няпроста».

Жанчыну па-чалавечы шкада. Вось толькі калі б не гэтыя зводкі. «За мінулы дзень ратавальнікі выязджалі на тушэнне лясного пажару ў Кіраўскі раён, два разы на тушэнне тарфяных пажараў у Бабруйскі і ў Асіповіцкі раёны, тры разы — на тушэнне сухой расліннасці ў Бялыніцкі, Краснапольскі і ў Шклоўскі раёны», — паведаміла **старшы інспектар абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Вольга НЕХАРОШЫХ**. Цяжка паверыць, што гэтыя лясныя трагедыі (разам з дрэвамі гінуць і яго жыхары — звяры, птушкі) абышліся без удзелу чалавека. Ці шмат для пажару трэба: дастаткова неасцярожна кінутага ў сухую траву недакурка. Сіноптыкі, на жаль, не абнадзейваюць. На выхадныя зноў абяцаюць днём да 30-35 градусаў цяпла, а ноччу да плюс 15-20. І ніякага дажджу. Таму лепш правесці чарговыя спякотныя выхадныя дзесьці каля вады. А лес хай крышачку ад нас адпачне.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Погляд

# Дасягненні ўдалай дзяржавы

**Не так даўно ў палітычны лексікон постсавецкіх краін увайшло невядомае раней заморскае словазлучэнне — «failed state», гэта значыць, дзяржава «няўдалая», «якая пацярпела крах». І найчасцей за ўсё яго можна пачуць якраз у дачыненні да краін Усходняй Еўропы. Крытэрыяў некалькі: эканамічныя праблемы, хісткасць дзяржаўнай улады, карупцыя, адсутнасць нацыянальнага кансэнсусу.**

Аднак у адрас нашай краіны нават самыя заўзятыя яе крытыкі ад падобнай ацэнкі ўстрымліваюцца. У чым прычына таго, што Беларусь выступае ў якасці своеасаблівага выключэння на фоне суседзяў? Натуральна, усё пазнаецца ў параўнанні.

З аднаго боку, наша паўднёвая суседка Украіна на сённяшні дзень, здаецца, увасабляе практычна ўсе прыкметы дзяржавы калі не «няўдалай», то, сама меней той, якая не вырашыла асноўных праблем, без чаго немагчыма яе далейшае існаванне і развіццё. Здавалася б, Украіна мела значна лепшыя стартавыя ўмовы пры адліку незалежнасці ў сілу большага багацця прыродных рэсурсаў, наяўнасці развітай прамысловасці. Тым не менш у выніку атрымалася стромкае піке.

Паўночныя суседзі — Літва і Латвія — доўгі час прэтэндавалі на статус «балтыйскіх тыграў», новых членаў ЕС з бурным эканамічным ростам. Рэальнасць апынулася куды празаічней. Чарада эканамічных крызісаў падкасіла светлыя перспектывы, а сяброўства з ЕС прывяло да дэмаграфічнай ямы, шанцы выбрацца з якой блізкія да нуля.

Менавіта цяпер, па заканчэнні першых 25 гадоў пасля распаду СССР, можна сапраўды параўноўваць дасягненні і вынікі. Беларусь аказалася не проста паспяховай, эфектыўнай дзяржавай, але і магчымым рэгіянальным лідарам. На наш погляд, ёсць некалькі асноўных прычын гэтага.

Па-першае, нованароджаная Рэспубліка Беларусь захавала сацыяльна-эканамічную пераемнасць з БССР, рэфармуючы тое, што неабходна было мяняць, але пакідаючы найлепшае са спадчыны, якая дасталася. Захаванне прамысловага патэнцыялу, сацыяльнай арыентацыі, адсутнасць траўмуючай грамадства «шокавай тэрапіі» і грабежнай прыватызацыі разам з адмовай ад палітыкі так званай «дэсаветызацыі» (сорам і «пакаянне», якія фактычна навязваюцца, за дасягненні і перамогі продкаў) — усё гэта стала трывалым фундаментам новай Беларусі.

Па-другое, не паддаліся ў нас і спакусе нацыяналізму. Амаль усе нашы суседзі шукалі апраўданні свайму існаванню ў проціпастаўленні сябе савецкаму мінуламу ці Расіі. А замест клопату пра рэальныя эканамічныя і грамадскія асновы суверэнітэту культывавалі гістарычныя крыўды або міфы аб славутым мінулым, якія не маюць ніякага дачынення ні да сучаснасці, ні да перспектыў будучыні. Нацыянальная мова, культура, гісторыя — усё гэта важна, але, калі выносіць толькі гэта на першае месца, можна цалкам страціць арыентацыю ў прасторы, пайсці лжывым шляхам і стаць аб'ектам маніпуляцый.

У Беларусі з яе партызанскім мінулым і калектыўнай памяццю пра падзеі апошняй вайны выпрацаваўся імунітэт да такіх формаў нацыяналізму, якія, на жаль, расцвілі зусім побач. Важна не толькі не страціць гэты імунітэт, выразнае распазнаванне дабра і зла, але і сваім прыкладам паказваць, што менавіта ў гэтым правільны выбар грамадства і дзяржавы. Беларусь не мае тэрытарыяльных спрэчак, унутранага расколу грамадства і якіх-небудзь гістарычных траўмаў, якія істотна ўплываюць на свядомасць і ўчынкі грамадзян.

Па-трэцяе, поспех Беларусі абумоўлены геапалітычным выбарам, пацверджаным усенародным рэферэндумам. Гэта выбар на карысць эканамічнай і ваенна-палітычнай інтэграцыі з Расіяй і актыўны ўдзел у стварэнні ўласнага полюса на еўразійскай прасторы. Гэта зусім не азначае, што Беларусь закрываецца ад Еўропы, наадварот, паказвае, што магчыма захаванне сваёй еўрапейскай ідэнтычнасці ў іншых формах. Разнастайнасць еўрапейскай цывілізацыі, яе эканамічных і палітычных варыяцый — гэта сутнасныя рэчы, якія Беларусь таксама паказвае і рэалізуе сваім прыкладам.

На аснове вышэйпералічаных элементаў у Беларусі ўдалося пабудаваць устойлівую дзяржаву, якая забяспечвае асноўныя патрэбы грамадзян у сферы эканомікі, бяспекі, аховы здароўя і адукацыі. Беларусь лідзіруе па якасці жыцця сярод краін СНД, найбуйнейшыя рэйтынгавыя агенцтвы адзначаюць відавочны прагрэс па асноўных сацыяльна-эканамічных паказчыках. Ды і самі беларусы ўвогуле падтрымліваюць курс, які рэалізуецца ўладай.

Вядома, далёка не ўсё радасна. Мы жывём у эпоху глабальнай эканамічнай і палітычнай турбулентнасці, праявы якой заўважаны ўжо непасрэдна ў нашых межах. Беларусь — не ізалявана ад астатняга свету, аўтаномна дрэйфуючы востраў, а краіна, цесна звязаная як з найбліжэйшымі суседзямі, так і з далёкімі партнёрамі. Мы падпадаем пад уплыў тых змен, не заўсёды пазітыўных, якія адбываюцца ў Расіі, ва Украіне, Заходняй Еўропе, Блізкім Усходзе.

У гэтых умовах захаванне пераемнасці курсу дзяржаўнага будаўніцтва пры адначасовым удасканаленні механізмаў кіравання і кантролю — гэта, бадай, адзіны залог далейшага паспяховага руху. Ужо запушчаны суперпраекты развіцця, якія неабходна давесці ды фазы запуску і аддачы: Беларуская АЭС, Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень», стварэнне магутнага лагістычнага хаба ў Беларусі як частка праекта эканамічнага пояса «Шаўковага шляху»...

20 гадоў Беларусь развівалася, выкарыстоўваючы ў асноўным той патэнцыял і тыя магчымасці, што дасталіся ў спадчыну ад БССР, зараз жа надыходзіць пераходны момант, калі неабходна закладваць падмурак новага этапу развіцця. Менавіта гэта і адбываецца, а змены, якія непазбежна рушаць услед, павінны падрыхтаваць грамадства і дзяржаву да новага рыўка.

Яго ажыццяўленне залежыць ад здольнасці грамадзян да ўнутранай мабілізацыі ў няпростых умовах, ад нацыянальнай кансалідацыі на аснове каштоўнасцей і ідэалаў, якія падзяляюцца пераважнай большасцю беларусаў, ад цвёрдага намеру ўлады прытрымлівацца курсу, які забяспечыў бы Беларусі ўстойлівасць і выжывальнасць. У гэтым залог нашага поспеху і нашай будучыні.

**Аляксей ДЗЕРМАНТ, навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі НАН Беларусі**

■ Футбол. Ліга Еўропы



Фота БЕЛТА.

# ФАТОС УСЯМУ ГАЛАВА!

**Нападаючы мінскага «Дынама» трапным ударам галавой не проста зраўняў лік у матчы з швейцарскім «Цюрыхам», але і вывеў каманду ў чацвёрты раўнд Лігі Еўропы.**

Напярэдадні паўторнай сустрэчы (а першая, нагадаем, завяршылася перамогай «дынамаўцаў» (1:0) швейцарскую каманду пакінулі некалькі ключавых футбалістаў. З-за няўдалых вынікаў кіраўніцтва развіталася з галоўным трэнерам Урсам Маерам. Многія казалі, што падобнае наўрад ці можа пайсці на карысць мінчанам, бо «Цюрых» прыедзе ў Брэст матываваным, па-спартыўнаму злосным. Так яно і атрымалася. Ужо на пачатку сустрэчы туніскі нападаючы швейцарцаў Амін Шэрміці адкрыў лік у сустрэчы. Праўда, такім ён застаўся аж да самага завяршэння сустрэчы, а значыць, футбалістаў чакалі яшчэ 30 хвілін дадатковага часу. І ў гэтым авертайме «Дынама» выглядала больш напорыста, аднак галоў усё не было. Многія нават ужо падрыхтаваліся да серыі пенальці, як за дзве хвіліны да завяршэння дадатковага часу чарнагорскі форвард «Дынама» галавой паразіў вароты «Цюрыха». 1:1 — якраз той лік, які дазваляе ісці далей беларусам!

— Мы рыхтаваліся да адкрытай гульні, — сказаў пасля **Вук РАШАВІЧ, галоўны трэнер «Дынама»**. — Не хацелі абараняцца. Наш план быў у гэтым. Думаю, што прадэманстравалі добры футбол. Стараліся, гулялі ў хуткі пас. Было некалькі нядрэнных момантаў, аднак не паспявалі забіваць.

Паводле лёсавання, якое адбылося ўчора ў швейцарскім Ньёне, за выхад у групавую стадыю Лігі Еўропы «Дынама» паспрачаецца з аўстрыйскім «Рэд Булам». Даведаліся імя свайго саперніка па барацьбе за выхад у Лігу чэмпіёнаў і футбалісты БАТЭ. У раўндзе плэй-оф барысаўчане згуляюць з сербскім «Партызанам».

**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*

**Як гулялі каманды з постсавецкай прасторы? Трэці кваліфікацыйны раўнд Лігі Еўропы**

«Рубін» (Казань) — «Штурм» (Аўстрыя) — 1:1 (першы матч — 3:2), «Абердзін» (Шатландыя) — «Кайрат» (Казахстан) — 1:1 (1:2), «Слован» (Славакія) — «Краснадар» (Расія) — 3:3 (0:2), «Зара» (Украіна) — «Шарлеруа» (Бельгія) — 3:0 (2:0), «Ворскла» (Украіна) — «Жыліна» (Славакія) — 3:1 (0:2), «Габала» (Азербайджан) — «Апалон» (Кіпр) — 1:0 (1:1), «Інтэр» (Азербайджан) — «Атлетык» (Іспанія) — 0:0 (0:2).

**РУП «БЕЛПОЧТА» СООБЩАЕТ О ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ**
**в Гродненской области: Гродненский р-н, д. Польница**
Дополнительная информация по **тел.: 8 (0152) 74-61-47**
и http://www.belpost.by/company/nedvigimost/ УНП 101015738

Совместное предприятие закрытое акционерное общество
**«Могилевский химкомбинат «Заря»**
сообщает, что **19 августа 2015 года в 12-00**
**состоится внеочередное общее собрание акционеров с повесткой дня:**
1. Об аннулировании части выпуска простых именных и привилегированных акций общества, выкупленных на баланс акционерного общества.
2. Об увеличении номинальной стоимости акций общества.
3. Об утверждении Уставного фонда общества.
4. О внесении изменений в Устав общества (принятие Устава общества в новой редакции).
Начало регистрации участников собрания в 11-00 час. Окончание регистрации в 11-50 час.
Место проведения собрания: г. Могилев, пр. Шмидта, 114 (актовый зал).
Дата формирования реестра владельцев ценных бумаг СП ЗАО «МХЗ» для составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров – 01.08.2015 г.
С материалами собрания можно ознакомиться 19.08.2015 г. (с 9-00 до 11-00) по месту нахождения общества.
Регистрация производится при предъявлении документа, удостоверяющего личность (паспорт), для представителя акционера – паспорта и доверенности.
УНП 700210051 **Наблюдательный совет.**

**РУП «БЕЛПОЧТА» ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРЕГОВОРОВ**
по выбору подрядной организации для создания геодезической разбивочной основы на строительстве объекта «Строительство производственного здания по обмену и обработке авиапочты на территории Национального аэропорта «Минск».
Процедура переговоров состоится «14» августа 2015 года в 10.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10. Контакты для получения дополнительной информации: отдел капитального строительства РУП «Белпочта» – **тел. 293-55-29, 293-55-28.**
УНП 101015738

**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ**
**Государственного предприятия «УКС Фрунзенского района г. Минска».**
**Дополнение и изменение к ранее опубликованным проектным декларациям в газете «Звязда»**
**Застройщик** – Государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических и индивидуальных предпринимателей 27.02.2014 № 190580553.
**Место нахождения:** 220073, г. Минск, 4-й Загородный пер., 64а.
Тел/факс 204-67-99, 399-53- 94; 256-64-18.
**Режим работы** – 8.45 — 18.00, обед 13.00 — 14.00; пятница 8.45 — 16.45, выходные дни: суббота, воскресенье.
**Информация о проекте.**
Объект «Многоэтажный жилой комплекс со встроенно-пристроенными помещениями административного, торгово-бытового назначения, гаражами-стоянками и фирменным магазином-салоном РУП «Издательство «Белбланкавыд» по ул. Я. Мавра, 32а».
Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий,
3 однокомнатные квартиры: №№ 62; 210; 214 (с индексацией, цена 1 кв.м — 16 041 000 руб.) площадью 43,7— 44,2 кв. метров;
6 двухкомнатных квартир: №№ 165 (с индексацией, цена 1 кв.м-16 870 000 руб.); 199 (с индексацией, цена 1 кв.м — 13 975 000 руб.); 246 (с индексацией цена 1 кв.м-16 437 000 руб.); 312 (с индексацией цена 1 кв.м — 16 751 000 руб.); 372 (с индексацией, цена 1 кв.м — 16 124 000 руб.); 420 (с индексацией, цена 1 кв.м — 16 550 000 руб.) площадью 59,50 — 69,3 кв. метров;
27 трехкомнатных квартир: №№ 20; 32; 60 (с индексацией, цена 1 кв.м-13 975 000 руб.); 120; 124; 164 (с индексацией, цена 1 кв.м — 14 844 000 руб.), 196; 212; 231; 239 (с индексацией, цена 1 кв.м — 13 975 000 руб.); 272; 275; 280; 291; 292; 295; 299; 300; 313; 317; 321; 337; 341; 411; 423; 427; 435 площадью 92,00 — 106,8 кв. метров.
Цена 1 кв. метра общей площади квартиры на дату опубликования проектной декларации составляет при строительстве однокомнатной квартиры – 17 500 000 белорусских рублей; двухкомнатной – 17 000 000 белорусских рублей; трехкомнатной – 15 000 000 белорусских рублей;
1 двухкомнатная квартира № 362 для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий (без господдержки), общей площадью 69,1 кв.м, цена 1 кв.м квартиры на дату опубликования проектной декларации составляет 13 287 000 белорусских рублей.
Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию жилого комплекса – сентябрь 2015 года.
С планировками квартир и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, 4-й Загородный пер., 64а, к. 101,102, тел. 399-53-94; 256-64-18.
Для заключения договора необходимо: личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) того лица, с кем заключается договор; оплата 40% стоимости объекта долевого строительства в течение 3 (трех) банковских дней с даты получения договора.
С момента опубликования настоящей декларации предложения, указанные в предыдущих декларациях, кроме декларации от 18.07.2015 № 135, считаются утратившими силу.
Указанная цена 1 кв.м общей площади квартир и их количество считаются действительными до момента опубликования новой декларации.
УНП 190580553

**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ**
**Государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска»**
**в дополнение и изменение**
**к ранее опубликованным проектным декларациям в газете «Звязда»**
**Застройщик** – Государственное предприятие «УКС Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 27.02.2014 № 190580553.
**Место нахождения:** 220073, Республика Беларусь, г. Минск, 4-й Загородный пер., 64а.
Тел/факс 204-67-99, 256-64-18.
**Режим работы** – 8.45-18.00, обед 13.00-14.00; пятница – 8.45-16.45, выходные дни: суббота, воскресенье.
**Информация о проекте.**
Проектом предусмотрено строительство 10-этажного жилого дома № 22 по генплану, расположенного во Фрунзенском административном районе г. Минска, на территории бывшей деревни Сухарево.
Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, 2 трехкомнатные квартиры: № 43 (1-й этаж), площадь 85,61 кв. м, цена 1 кв. м общей площади квартиры на дату опубликования проектной декларации составляет 13 200 000 белорусских рублей; № 33 (9-й этаж), площадь 92,2 кв. м, цена 1 кв. м общей площади квартиры на дату опубликования проектной декларации составляет 14 700 000 белорусских рублей.
Начало строительства – 25.11.2014 г., окончание – сентябрь 2015 г.
С планировками квартир и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, 4-й Загородный пер., 64а, к. 102, тел. 256-64-18.
Для заключения договора необходимо:
- личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) лица, с кем заключается договор;
- оплата 30% стоимости объекта долевого строительства в течение 3 (трех) банковских дней с даты получения договора.
Указанная в настоящей проектной декларации цена 1 кв. м общей площади квартир и их количество считаются действительными до момента опубликования новой декларации.
УНП 190580553

■ Нашы

# ШТО ПАТРЭБНА ДЛЯ ШЧАСЦЯ?

## Для Аркадзя Тоўсціка, рэдактара газеты «Звязда» з 1973 па 1986 год, праца ў рэдакцыі была любімай справай

**Заўтра нашай «Звяздзе» — найстарэйшай газеце краіны — споўніцца 98 гадоў! Самы час, шпацыруючы па мінскіх вуліцах, спыніцца каля помнікаў і мемарыяльных шыльдаў, якімі ўвекавечана памяць газеты-падпольшчыцы, «Звязды»-партызанкі.**

**Стоячы перад помнікам журналістам-падпольшчыкам, што ля Чырвонага касцёла, а таксама ў сімвалічных месцах на вуліцах Кульман, Караля, Беларускай і ля Дома друку, варта ўзгадаць Аркадзя Апанасавіча Тоўсціка — былога рэдактара газеты «Звязда». Менавіта па яго ініцыятыве ўзніклі гэтыя дарагія для нас і, спадзяёмся, для вас месцы.**

**А чым яшчэ запомніўся Аркадзь Тоўсцік, які рэдагаваў галоўную партыйную газету краіны з сакавіка 1973 па кастрычнік 1986 года? З якімі вядомымі асобамі таго часу сябраваў выдатны журналіст, грамадскі дзеяч, партыйны работнік? Чым любіў займацца ў вольны ад працы час? Які ён быў бацька, сем'янін? Пра гэта і шмат што іншае нам расказала яго дачка Ірына Тоўсцік, якая, дарэчы, нядаўна напісала кнігу «Наканавана лёсам. Тоўсцік Аркадзь Апанасавіч: журналіст, галоўны рэдактар, грамадскі дзеяч, абаронца Айчыны».**

***— Ірына Аркадзеўна, у якой сям'і нарадзіўся Аркадзь Тоўсцік? Адкуль вашы карані?***

— Бацька нарадзіўся ў вёсцы Чыкілі Глускага раёна Бабруйскай вобласці (зараз — Магілёўскай). Яго тата, мой дзед, быў старшынёй сельскага Савета, маці займалася гаспадаркай. У сям'і выхоўвалі траіх сыноў. Аркадзь Апанасавіч быў сярэднім.

***— Як з вясковага хлопца вырас знаўца беларускай мовы і літаратуры, культуры і гісторыі сваёй краіны?***

— Ён быў сынам свайго часу. Пры савецкай уладзе чытанню газет і літаратуры надавалася вельмі вялікая ўвага. У хаце старшыні сельсавета газеты і кнігі былі заўсёды. Падлеткам Аркадзь Апанасавіч чытаў перыёдыку сялянам. А калі камусьці з аднавяскоўцаў трэба было нешта напісаць, ён з задавальненнем дапамагаў. Таму цяга да творчасці і літаратуры ў бацькі ўзнікла яшчэ ў дзяцінстве. Яго любімай кнігай была «Дзікая сабака дзінга, або Аповесць аб першым каханні» Фраермана. Аднойчы тата адправіў свой допіс у газету «Піянер Беларусі» і ад вядомага пасля пісьменніка атрымаў адказ з блаславеннем на далейшую творчасць. Яму падабалася пісаць, інакш гэтым не займаўся б. Увогуле, бацька быў такім чалавекам, які рабіў толькі тое, што любіў і хацеў.

***— Відаць, гэта тычыцца і абароны Айчыны... Бо як інакш зразумець тое, што ў 15-гадовым узросце Аркадзь Тоўсцік пайшоў у партызаны, а пасля вызвалення Беларусі «прыпісаў» сабе год, каб узялі ў войска?***

— Ён не проста пайшоў у партызаны. Бацька прымаў удзел у баявых дзеяннях — быў кулямётчыкам. Кулямёт заўсёды насіў за плячыма. Расказваў, што «бывае, ідзеш з гэтым кулямётам і спіш». Разам з ім у партызанах апынуліся бацькі, браты Андрэй і Мікалай (апошні быў сакратаром Бабруйскага падпольнага райкама камсамола). Мой дзед Апанас, як яго звалі, адказваў у атрадзе за ўсе гаспадарчыя справы. Бацька быў узнагароджаны двума баявымі медалямі «За адвагу»: адзін атрымаў за подзвігі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, другі — за геройчную службу ў Савецкай Арміі, куды пайшоў пасля вызвалення Беларусі.

***— Неаднойчы Аркадзь Апанасавіч прызнаваўся, што вайна для яго была самым цяжкім успамінам...***

— Гэта праўда. На яго вачах забілі маці... Гэта была самая вялікая трагедыя ў яго жыцці. Калі скончылася чарговая блакада, партызанскія жонкі пайшлі ў вёску. Перад вайной сяляне закопвалі свой скарб. Бацька, напрыклад, закапаў падшыўку газет, кнігі — гэта для яго было самым каштоўным. І тады партызанскія жонкі, у тым ліку мая бабуля, прыйшлі ў вёску, каб дастаць гэтыя рэчы і прасушыць іх. Тое ўбачыў адзін аднавяскоўец — дарэчы, па прозвішчы Тоўсцік — і расказаў пра гэта паліцаям. Гітлераўцы, якія прыйшлі ў вёску, выстраілі жанчын у шарэнгу, а той здраднік падыходзіў да кожнай і казаў, хто чый муж. Не схлусіў і пра бабулю, Арыну Антонаўну. Фашыст у яе выстраліў. Яна была толькі паранена. Дабілі потым: куляй у лоб. Бацька і дзед гэта бачылі, але нічога зрабіць не маглі. Потым яны прывезлі бабулю ў вёску на падводзе. У яе былі вельмі доўгія валасы, і бацька запомніў, што калі яе пераносілі ў хату, матчына каса пакінула на белай сцяне крывавы след. Заўсёды перад вачыма Аркадзя Апанасавіча стаяла гэтая карціна, і ўвесь час ён адчуваў сябе асірацелым. Пазней, быццам просячы прабачэння ў маці, што нічым не маглі ёй тады дапамагчы, тры сыны пакляліся назваць сваіх будучых дачок Ірынамі. Абяцанне сваё стрымалі: у нашай вялікай сям'і тры Ірыны, у тым ліку я.


У часы службы ў Савецкай Арміі (Аркадзь Апанасавіч злева).

***— Аркадзя Тоўсціка называюць старажылам беларускай журналістыкі. Але мала хто ведае, што журналісцкаму майстэрству ён нідзе не вучыўся...***

— Сапраўды, журналісцкай адукацыі ў яго не было. Бацька скончыў літаратурны факультэт Бабруйскага дзяржаўнага інстытута, потым — педагагічны інстытут у Мінску (сучасны Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка). Калі ён працаваў у ЦК, бацьку прапаноўвалі ехаць вучыцца ў Маскву, у Акадэмію грамадскіх навук — магчыма, на аддзяленне журналістыкі. Але ён адмовіўся: не хацеў пакідаць сям'ю. Сям'я значыла для яго вельмі шмат, і ён не ўяўляў, што пакіне яе на два гады.


Аркадзь Апанасавіч Тоўсцік і Пётр Міронавіч Машэраў у прэзідыуме ўрачыстага сходу, прысвечанага 60-годдзю «Звязды».

***— На працягу 13 гадоў Аркадзь Апанасавіч быў галоўным рэдактарам «Звязды», жыў справамі любімай газеты і калі пайшоў у заслужаны адпачынак. Ці можна сказаць, што рэдакцыя стала для яго другім домам, а звяздоўцы — членамі сям'і?***

— Праца для яго была заўсёды на першым месцы. А праца ў «Звяздзе» стала не проста службай, а любімай справай. Ён любіў гэтую работу, у першую чаргу, за тое, што яна была цікавай. Любіў людзей, а праца ў газеце была надзвычай багатай на сустрэчы. Ён заўсёды імкнуўся дапамагчы людзям. Вы не ўяўляеце, што адбывалася ў нас дома. Да нас увесь час нехта прыходзіў, прыязджаў з вёскі: бацька заўсёды іх кудысьці ўладкоўваў, камусьці дапамагаў. У яго гэта было ў крыві. Дзякуючы яму многія журналісты атрымалі кватэры. Ён добра разумеў, што чалавеку патрэбна для шчасця. Аркадзь Апанасавіч быў вялікі гуманіст, у тым ліку ў дачыненні да сваіх калег-звяздоўцаў.

***— Ці праўда, што на пасаду галоўнага рэдактара «благаславіў» яго сам Машэраў?***

— Можна і так сказаць. Пётр Міронавіч высока цаніў творчыя і арганізатарскія здольнасці бацькі. Падчас аднаго з пасяджэнняў у Чырвонай Слабадзе, дзе бацька працаваў першым сакратаром райкама ЛКСМБ, прысутнічаў Машэраў. Ён застаўся задаволеным маладым кіраўніком-камсамольцам і запрасіў Аркадзя Апанасавіча на работу ў ЦК камсамола Беларусі. Падчас працы там тата не расставаўся з журналісцкім пяром. Потым быў загадчыкам аддзела ў «Чырвонай Змене», а пасля — намеснікам загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПБ. А з лёгкай рукі Пятра Міронавіча тата ўзначаліў калектыў рэдакцыі «Звязды». Вядома, гэта было калектыўнае рашэнне, бо пытанне абмяркоўвалася на пасяджэнні бюро ЦК КПБ.

***— На ваш погляд, ці апраўдаў такі высокі давер Аркадзь Апанасавіч?***

— На той час «Звязда» была першай партыйнай газетай у рэспубліцы. Бацька ўвесь час імкнуўся пашырыць межы партыйнага выдання. Гэта не быў сухі лісток, які пісаў пра справы партыйных арганізацый. Мне здаецца, што самая вялікая яго заслуга ў тым, што бацька, як сёння б сказалі, зрабіў газету чытэльнай. У першую чаргу яе пачала чытаць інтэлігенцыя. Тата стварыў у рэдакцыі савет, куды ўваходзілі прадстаўнікі розных галін народнай гаспадаркі. У асноўным гэта былі кіраўнікі. Бацька добра разумеў, што калі на старонках газеты выступіць вядомы чалавек, то тыраж разыдзецца хутчэй. Але гэта не значыць, што не пісалі пра простых людзей. Таксама Аркадзь Апанасавіч аддаў некалькі старонак газеты пад публікацыю нарысаў і ўрыўкаў з твораў пісьменнікаў.

***— Яны, напэўна, былі частымі гасцямі ў кабінеце галоўнага рэдактара?***

— Бацька працаваў у той час, калі яшчэ былі жывыя многія класікі беларускай літаратуры. Яны часта сустракаліся: у рэдакцыі і па-за яе межамі. Сябраваў з Шамякіным, хадзіў на спектаклі Макаёнка. Бацька вельмі шкадаваў аб тым, што аддаў адзін з вершаў Петруся Броўкі тагачаснаму работніку ЦК КПБ. Напярэдадні сваёй смерці пісьменнік прыйшоў да таты і прапанаваў адзін са сваіх апошніх твораў, у якім выказваў асцярогу, што можа пачацца трэцяя сусветная вайна. Тады бацька палічыў, што ён не можа пакінуць верш такога вялікага чалавека ў сябе і аддаў яго ў ЦК, аб чым потым вельмі шкадаваў, бо твор кудысьці знік і ніколі не быў апублікаваны.

***— Народны пісьменнік БССР Іван Шамякін ніколі не ўтойваў, што ідэю для рамана «Вазьму твой боль» падказаў яму Аркадзь Тоўсцік...***

— Аднойчы бацька расказаў Івану Пятровічу пра тое, што ў суседнюю вёску Старое Сяло пасля вайны прыехаў былы паліцай, які ўжо адсядзеў у турме. Жыхары з бацькавай вёскі не маглі дараваць яму былых злачынстваў і забілі. Як і хто гэта зрабіў — невядома. Гэты сюжэт і пакладзены ў аснову рамана «Вазьму твой боль», па якім пасля быў зняты аднайменны фільм. Сцэнарыст кінастужкі Іван Шамякін, рэжысёр Міхаіл Пташук і галоўны акцёр Уладзімір Гасцюхін у 1982 годзе атрымалі Дзяржаўную прэмію БССР.

***— Не сакрэт, што ваш бацька старанна падыходзіў да адбору кадраў у «Звязду». Менавіта ён даў пуцёўку ў жыццё многім вядомым сёння журналістам...***

— Многіх з іх ён убачыў на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, дзе на працягу многіх гадоў узначальваў Дзяржаўную экзаменацыйную камісію. Аркадзь Апанасавіч браў на працу людзей не па пратэкцыі. Ён умеў ацаніць, чаго чалавек варты. І час паказаў, што тыя, каго бацька ўзяў на працу, сталі таленавітымі журналістамі. Уладзімір Наркевіч, напрыклад, пасля ўзначаліў «Звязду». Пра ўсе свае кадры, якія потым паспяхова тварылі на глебе журналістыкі, бацька расказаў у сваіх кнігах-успамінах — такім чынам падзякаваў журналістам за сумленную працу.

***— Дарэчы, той жа Уладзімір Браніслававіч, які рэдагаваў «Звязду» з 1989-га па 2011 год, у сваёй прамове да вашай кнігі пра бацьку называе Аркадзя Тоўсціка сціплым чалавекам, але не сціплым рэдактарам. А якім Аркадзь Апанасавіч быў бацькам? Чым ён займаўся ў вольны ад працы час?***

— Я вам магу паказаць нашу бібліятэку, і вам адразу стане ўсё зразумела. (У кожным з чатырох пакояў — вялікія стэлажы з кнігамі. Прызнаюся, такой хатняй бібліятэкі я пакуль не бачыла ні ў аднаго беларускага пісьменніка! — **Аўт.**) Дома бацька быў вельмі пяшчотным і карэктным. За ўвесь час, калі мы жылі разам, ён ніколі ні на кога з членаў сям'і не павысіў голасу. Я не кажу пра тое, што мы былі ідэальнымі дзецьмі. Але калі трэба было тупнуць нагой і крыкнуць, ён гэтага не рабіў. Бацькі цанілі кожную хвіліну жыцця. Яны заўсёды жылі з густам: любілі і добра паесці, і прыгожа апрануцца, і схадзіць у тэатр, наведаць сяброў. Кожнае лета мы ездзілі адпачываць у Крым. Нам было вельмі добра разам. Шмат было агульных інтарэсаў.

***— Па кнігах, якія складаюць хатнюю бібліятэку, відаць, што Аркадзь Апанасавіч цікавіўся гісторыяй Вялікай Айчыннай вайны. Менавіта пры яго рэдактарстве гэтая тэма ў «Звяздзе», што называецца, загучала...***

— Ён быў паранены тэмай партызанаў. Збіраў кнігі пра партызанскі рух. Яшчэ будучы ў ЦК КПБ, напісаў артыкул пра гісторыю падпольнай «Звязды» ў Беларускую энцыклапедыю. Потым, калі працаваў у рэдакцыі, з яго падачы ў Мінску, а таксама ў вёсцы Дварэц Любанскага раёна ўвекавечылі ўсе месцы, звязаныя з выхадам падпольнай газеты. Ён лічыў, што толькі геройчныя людзі маглі выпускаць у такіх умовах газету. Вельмі прасякнуўся гераізмам падпольшчыкаў. І тое, што бацька зрабіў, стала данінай памяці ўсім загінулым падчас вайны журналістам.


Аркадзь Апанасавіч з жонкай Аленаю Рыгораўнай.

• • •

*За свае журналісцкія справы Аркадзь Тоўсцік двойчы быў удастоены галоўнай узнагароды Міжнароднай арганізацыі журналістаў, якая існавала ў часы Савецкага Саюза, медалём Юліуса Фучыка — антыфашыста, закатаванага гітлераўцамі, словы якога актуальныя і сёння: «Людзі, будзьце пільнымі!» Гэта сведчыць аб тым, што і ў мірны час Аркадзь Апанасавіч служыў Айчыне, абараняў яе інтарэсы, захоўваў гістарычную памяць беларускага народа, сваёй любімай «Звязды».*

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*
**Фота з архіва Ірыны ТОЎСЦІК.**

■ Гісторыя газеты — гісторыя краіны

# «У СКАРБНІЦЫ ГАЗЕТЫ ШМАТ СЛАЎНЫХ СТАРОНАК...»

**Заўтра нашай газеце споўніцца 98 гадоў. Гэта цэлая эпоха: з рэвалюцыяй, грамадзянскай вайной, дзяржаўным будаўніцтвам, сталінскімі рэпрэсіямі, барацьбой супраць фашызму, аднаўленнем краіны, халоднай вайной, перабудовай і атрыманнем незалежнасці. Пра што ж пісала газета на розных этапах свайго жыцця і жыцця краіны — спачатку савецкай, а потым незалежнай Беларусі?**

Нумары газеты за 1918 і за 1937 год я прагартала ў электронным каталогу Прэзідэнцкай бібліятэкі — ужо каля двух гадоў яна займаецца «пераводам» сваіх фондаў у «лічбу». У бібліятэцы захаваліся нумары газеты «Звязда» аж з 1918 года, ужо алічбаваны падшыўкі да 1945 года, але праца працягваецца. Як патлумачыў мне Валерый Герасімаў, загадчык аддзела старадрукаў і рэдкіх выданняў, алічбоўка неабходна таму, што ад частага выкарыстання старыя газеты псуюцца. А падшыўкі «Звязды» заказваюць часта — і навукоўцы, і парламентарыі, што рыхтуюць чарговы законапраект, і работнікі культуры і адукацыі, студэнты.

— Вы, відаць, бачылі на сканах, што краі газетных лістоў пацёртыя, хоць мы па магчымасці адрэтушавалі старонкі, — заўважае суразмоўца. — Папера тых гадоў, так званая «кіслотная», зроблена з цэлюлозы. І яна вельмі ненадзейная: распадаецца, крышыцца. Умовы захоўвання патрабуюць 55% вільготнасці. Калі ж вільготнасць меншая, то папера становіцца такой крохкай, што проста ламаецца. Нават цэнтральныя газеты — «Звязда», «Рабочий», «Советская Белоруссия» — захаваліся не ўсе.

### 1918: першы святочны нумар

«Звязда», як вядома, пачала выходзіць у 1917 годзе, калі Краіна Саветаў не была яшчэ створана. Тым не менш, паколькі газета з'яўлялася органам Заходняга абласнога і Смаленскага камітэтаў Расійскай камуністычнай партыі бальшавікоў, літаральна ўсе матэрыялы мелі агітацыйны характар або характар паведамлення, цікавага найперш членам камуністычнай партыі. Вось, напрыклад, анонс аднаго са жнівеньскіх нумароў газеты:

*«Сёння ў «Звяздзе»:*
*Артыкулы:*
*Чэхаславацкая язва.*
*Аб працоўнай дысцыпліне.*
*Фельетон:*
*Бальшавізм за мяжой ....»*

**Летам 1918 года** газету вельмі турбаваў «наплыў» у вёскі агітатараў ад правых сацыялістычных партый, якія накіроўваюць «сялянскія масы супраць іх жа Саветаў». У той жа час, пішучы пра навіны мясцовага характару, «Звязда» асноўную ўвагу надавала нарадам вясковай беднаты, сустрэчам і з'ездам рабочых, лекцыям, што чыталіся актывістамі камуністычнай партыі.

А вось нумар газеты за **9 жніўня** быў сапраўды святочным — рэдакцыйны калектыў адзначаў першы дзень нараджэння выдання. У газеце змешчаны нарыс па гісторыі газеты, а таксама яе аўтабіяграфія. Вядомыя дзеячы будучай БССР А. Мяснікоў і В. Кнорын дасылаюць допісы «Успаміны» і «Звязда» і Мінскі Савет». Публіцыст Георгій Фанвіч змяшчае фельетон «Незгасальная «Звязда».

### 1937: дасягненні Саветаў і барацьба са шкодніцтвам

«Героі сталінскай эпохі — адважныя лётчыкі Громаў, Юмашоў і Данілін — на самалёце «АНТ-25» праляцелі Паўночны полюс і зараз нясуцца над прасторамі Паўночнай Амерыкі», — з такім паведамленнем выходзіць «Звязда» **14 ліпеня 1937 года.**

Асобна пра дасягненні беларусаў не пісалася — барацьба з нацыяналізмам ішла, што называецца, па ўсіх франтах.

Адной з найважнейшых тэм у газеце была сельская гаспадарка. Друкаваліся рэпартажы пра жыццё ў савецкай вёсцы, у калгасах і кааператывах. Аднак побач з імі ў кожным нумары былі нататкі або пастановы, дзе ў загалоўку гучала фатальнае для многіх слова «шкодніцтва». Так, нумар «Звязды» за **4 жніўня** таго ж года выйшаў з наступнай пастановай Савета Народных Камісараў СССР: «Аб аказанні дапамогі калгаснаму сялянству Беларускай ССР і аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў справе калгаснага ўпарадкавання».

**9 жніўня** «Звязда» не святкавала свой 20-гадовы юбілей. Прынамсі, нумар быў звычайным, не святочным. Тэмай нумара стала «ўзорная сяўба азімых». У заметцы пад назвай «Да канца выкарчуем шпіёнаў і дыверсантаў» пісалася пра сходы і мітынгі, якія адбыліся пасля публікацыі вышэйзгаданай пастановы СНК «Аб аказанні дапамогі калгаснаму сялянству».

### 1957: у трэндзе — будаўніцтва жылля

Краіна ўжо адбудавалася пасля вайны, памёр Сталін, а разам з ім завяршылася эпоха барацьбы са «шкодніцтвам» і «шпіёнамі», калі людзі баяліся начнога стуку ў дзверы або ў акно. Усё значна больш дэмакратычна, і па змесце газеты відаць, што адным з самых важных кірункаў дзяржаўнай палітыкі цяпер з'яўляецца клопат пра чалавека.

У «адлігу» адным з галоўных тэматычных напрамкаў «Звязды» стала будаўніцтва жылля. Будаўнікам, архітэктарам, а таксама тым, хто нядаўна атрымаў новую кватэру, прысвячаліся рэпартажы і фотарэпартажы. У адным з нумароў газеты, што выйшаў на пачатку жніўня, пад агульным загалоўкам «Больш кватэр працоўным» друкуецца шэраг матэрыялаў на гэтую тэму, а ілюструецца паласа фотаздымкам В. Калядзінскага, прысвечаным здачы 68-кватэрнага дома для чыгуначнікаў на вуліцы Свярдлова ў Мінску. Рэпартаж з Магілёўскага металургічнага завода расказвае, як успрынялі людзі нядаўна абнародаваную Пастанову ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР аб развіцці жыллёвага будаўніцтва.

«Правільнае гэта рашэнне, — прыводзіць карэспандэнт словы Аляксея Казлова, рабочага транспартнага цэха металургічнага завода. — У нашай Комуністычнай партыі слова не разыходзіцца са справай. Калі яна сказала, значыць, так і будзе, праблема жылля будзе хутка вырашана».

У той жа час не дае забыць пра сябе процістаянне сацыялістычнага і капіталістычнага лагераў. Рубрыка «За рубяжом» займае ледзь не паўпаласы (а газета тады выходзіла толькі ў вялікім фармаце — А2) і змяшчала як матэрыялы пра падзеі з «сяброўскіх краін» («Атамны рэактар у Румыніі ўступіў у строй», «Вугальная прамысловасць Венгрыі на ўздыме», «Сельскагаспадарчае машынабудаванне ў Польшчы»), так і пра сітуацыю ў «варожым лагеры»: «Больш адной трэці заробку ідзе на выплату падаткаў у ЗША».

На 40-годдзе «Звязды» выйшаў сапраўдны святочны нумар, які складаўся з віншаванняў ад вядомых партыйных і культурных дзеячаў БССР і Савецкага Саюза, замалёвак пра гісторыю газеты, допісаў чытачоў. Была змешчана і фотакопія самага першага нумара газеты. На апошняй старонцы змешчаны рэпартаж «Пра тых, хто выпускае газету».

### 1977: 60-я гадавіна Кастрычніка

У гэтым годзе святкавалася 60-я гадавіна Кастрычніцкай рэвалюцыі, таму многія матэрыялы нават не кастрычніцкіх нумароў былі прысвечаны перамозе рэвалюцыі. У адным з летніх нумароў я знайшла і фотарэпартаж Яўгена Пясецкага, які і сёння працуе ў «Звяздзе». Рэпартаж прысвечаны касьбе канюшыны ў Гродзенскім раёне — у калгасе «Шлях камунізма».


БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗВЯЗДА
кошт 2000 рублёў
АДАМЧУКА І ЯГО РАСІЙСКІХ КАЛЕГ АДДАЛІ Ў РУКІ ЖОНАК
ДАСТОЕВА:

Савецкі Саюз нездарма лічыўся ці не самай адукаванай краінай свету. Газета «Звязда» шмат увагі надавала тэме адукацыі. Так, вялікі матэрыял Уладзіміра Наркевіча пад назвай «Пачатак дарогі» прысвечаны ўступным экзаменам у ВНУ і тэхнікумах рэспублікі.

«Экзамены толькі пачаліся. Якія ж самыя першыя ўражанні ў экзаменатараў?

— Пакуль мы задаволены, — гаворыць дацэнт кафедры фізікі А.І. Болсан. — У асноўным, абітурыенты паказваюць добрыя веды, часта ставім «пяцёркі».

Святочнага нумара на 9 жніўня не было — ён быў прысвечаны жніву. Праўда, адзін матэрыял усётакі быў прысвечаны самой «Звяздзе» — нарыс пра тое, як была створана газета ў далёкім 1917-м.

### 1997: пра людзей і для людзей

Гартаючы падшыўку за гэты год, я бачыла матэрыялы, падрыхтаваныя сённяшнім калектывам «Звязды»: Сяргеем Расолькам, Надзеяй Нікалаевай, Анатолем Клешчуком, Яўгенам Пясецкім, Аленай Ляўковіч, Сяргеем Куркачом, Ларысай Цімошык... Газета тады была яшчэ чорна-белай, але матэрыялы ад гэтага не станавіліся менш яркімі. Рубрыка «Глыбінка» пераходзіла з нумара ў нумар: друкаваліся рэпартажы са жніва на Піншчыне, дзе жанчыны на сваіх участках убіралі збожжа па-старому — сярпамі, з аўтэнтычных куткоў Браслаўскага раёна.

**9 жніўня** газета адзначыла 80-годдзе. Нумар быў святочны.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703 |
| Продавец | Открытое акционерное общество «Гродненская обувная фабрика «Неман», Гродненская обл., г. Гродно, ул. Советских Пограничников, д. 95. |

Предмет аукциона

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| Столовая | Помещение общественного питания | 2953,9 кв. м | 400/D-150913 | Гродненская обл., г. Гродно, ул. Гагарина, д. 41-1 |

**Обременения:** договор аренды сроком до 01.12.2018. Арендуемая площадь – 743,9 кв. м (ресторан «Топаз»). Ставка арендной платы за 1 кв. м – 0,46 базовой арендной величины.

**Сведения о земельном участке:** изолированное помещение расположено на земельном участке пл. 0,4389 га, предоставленном продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания здания столовой.

**Дополнительная информация:** в результате вычленения изолированных помещений из капитального строения с инвентарным номером 400/С-1064 (здание столовой) образованы помещение общественного питания (столовая) с инвентарным номером 400/D-150913 и помещение гражданской обороны (бомбоубежище) с инвентарным номером 400/D-150914. Бомбоубежище не подлежит продаже и остается в собственности продавца

***Начальная цена с НДС 20% – 13 966 800 000 белорусских рублей.***

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| Срок подписания договора купли-продажи | 15 рабочих дней после проведения аукциона |

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 23.06.2015 г.

| | |
|---|---|
| Дата и время проведения аукциона | 10.09.2015 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки» |
| Дата и время окончания приема документов | 08.09.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки» |
| Контактные данные | **Тел. +375-17-280-36-37, +375-29-183-69-71,** Email: auction@cpo.by, www.cpo.by |

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ
### О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
### на право заключения договоров аренды земельного участка для строительства и обслуживания многоквартирного жилого дома в г. Смолевичи, ул. Зеленая

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | г. Смолевичи, ул. Советская, 125. Смолевичский райисполком, зал заседаний, 10.09.2015 г. в 11.00 |
| 3 | **Продавец и его адрес** | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | **Лот №1 –** площадь 0,3878 га, кадастровый номер 624850100001000927 г. Смолевичи, ул. Зеленая |
| 5 | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Лот №1 – для строительства и обслуживания многоквартирного жилого дома |
| 7 | **Сроки аренды** | Лот № 1 – 99 (девяноста девять) лет |
| 8 | **Сроки заключения договора аренды** | После оплаты стоимости предмета аукциона в течение 2 рабочих дней |
| 9 | **Начальная (стартовая) цена продажи** | Лот № 1 – 800 000 000 рублей |
| 10 | **Условия аукциона** | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть индивидуальные предприниматели, юридические лица;<br>безвозмездная передача в собственность Смолевичского райисполкома 7% общей площади жилых помещений в многоквартирном жилом доме (п.1.5 решения Миноблисполкома от 14 ноября 2014 г. № 978);<br>В) При проектировании и строительстве учесть регламент использования и застройки земельного участка, установленный градостроительным паспортом;<br>Г) обеспечить вынос инженерных сетей с сохранением подключения внешних потребителей (согласно технических условий заинтересованных организаций) с пятна застройки;<br>Д) наличие не менее двух участников |
| 11 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | Лот № 1 – электроснабжение, газоснабжение, водоснабжение, централизованное водоотведение |
| 12 | **Условия оплаты** | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| 13 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной стартовой цены на р/с 3641000000205 ЦБУ 621 филиала № 616 АСБ «Беларусбанк», г. Жодино, код 812, УНП 600014139, ОКПУ 04064735, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок») |
| 14 | **Окончательный срок приема документов** | 4 сентября 2015 г. – 17.00 |

Затраты на организацию и проведение аукциона (изготовление землеустроительного дела, осуществление государственной регистрации создания земельного участка, публикация информационного сообщения, изготовление градостроительного паспорта) подлежат возмещению победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона.

**Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемым земельным участком –** каждый четверг с 9.00 до 13.00.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу:** г. Смолевичи, ул. Подлесная, д.11, каб. № 8.

**Окончательный срок приема заявлений –** 04.09.2015 г., 17.00.

**Контактный телефон (8-01776) 55-3-42.**

**Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:**

- заявление на участие в аукционе;
- документ подтверждающий внесение суммы задатка на текущий расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
- индивидуальным предпринимателем – копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели и юридические лица, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

**Неявка участника аукциона на аукцион признается отказом в его участии.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
### по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества

**Организатор аукциона:** Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

**Продавец:** Транспортное республиканское унитарное предприятие «Витебское отделение Белорусской железной дороги», г. Витебск, ул. Космонавтов, 10, тел. (0212) 37-89-72

**Лот №1.** Право на заключение договора аренды сроком на 3 года: нежилых помещений площадью 276,7 кв. м, расположенных на 2-м этаже капитального строения с инвентарным №200/С-41815 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Космонавтов, 10Г (административное здание); части нежилого помещения площадью 10,44 кв. м, расположенного на 1-м этаже капитального строения с инвентарным №200/С-56147 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Космонавтов, 8 (здание железнодорожного вокзала). Размер ежемесячной арендной платы 258,43 базовой арендной величины. Целевое использование: для производства пищевой продукции и организации общественного питания. ***Начальная цена: 8 614 200 белорусских рублей. Размер задатка: 861 000 белорусских рублей.***

Дата, время и место проведения аукциона: 08.09.2015 в 15.00. г. Витебск, проезд Гоголя, 5, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи документов: с 10.08.2015 с 8.30 по 07.09.2015 до 17.30

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 8 августа 2009 г. №1049. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы, предоставить: копию платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона; юр. лицом – резидентом РБ: копию документа, подтверждающую гос. регистрацию юр. лица; юр. лицом – нерезидентом РБ: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; индивидуальным предпринимателем: копию документа, подтверждающего гос. регистрацию индивидуального предпринимателя. При подаче заявления на участие в аукционе предъявляется документ, удостоверяющий личность; представителями – оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица). Победитель аукциона – лицо, предложившее самую высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) обязан оплатить предмет аукциона, затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; заключить договор аренды недвижимого имущества не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. В случаях, если Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол аукциона; не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона; не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона; не подписал договор аренды, а также, в случае если участники аукциона, отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин. Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона: №3012078870010 ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», БИК 153001117, г. Витебск, ул. Ленина, 17, УНП 390477566.

**Контактные тел: (0212) 42-61-62,** e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by

## ИЗМЕНЕНИЯ К ПРОЕКТНЫМ ДЕКЛАРАЦИЯМ

**по объекту «Застройка жилых кварталов с объектами социальной инфраструктуры в границах пр. Дзержинского – пр. Любимова – ул. Семашко (2-я очередь строительства). Жилой дом № 18 по генплану»,**
*опубликованным в газете «Звязда» № 41 от 05.03.2014, № 55 от 24.03.2015*

Застройщик – коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» – доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменений в проектные декларации «Застройка жилых кварталов с объектами социальной инфраструктуры в границах пр. Дзержинского – пр. Любимова – ул. Семашко (2-я очередь строительства). Жилой дом № 18 по генплану», опубликованные в газете «Звязда» № 41 от 05.03.2014, № 55 от 24.03.2015.

**Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для юридических лиц и граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагается 1 однокомнатная квартира на 8 этаже общей площадью 45,76 кв. м стоимостью за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном 1 200 долларов США.**

**Условия оплаты –** единовременная оплата всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение 10 (десяти) календарных дней со дня регистрации договора в Мингорисполкоме.

**Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для юридических лиц и граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются 15 квартир на 8-15, 16-19, 21-22 и 24-25 этажах, в том числе:**

- двухкомнатные квартиры стоимостью за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном **1 150 долларов США;**
- трехкомнатные квартиры стоимостью за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном **1 100 долларов США.**

**Условия оплаты –** первоначальный взнос в размере **50% стоимости** объекта долевого строительства в течение **10 (десяти) банковских дней** со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма – в рассрочку до 6 месяцев в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору.

Оплата производится в белорусских рублях по курсу НБ РБ на дату оплаты.

**Для заключения договоров необходимы:**

- паспорт и личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор.

Документы для заключения договоров будут приниматься с 13.08.2015. Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных квартир.

Срок действия настоящей проектной декларации – до момента опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие настоящей.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству жилого дома можно получить по адресу: г. Минск, ул. Сергея Есенина, д. 4, офис 107, каб. 1, **тел. (017) 234-16-98, (044) 795-44-44.** Сайт компании: www.uks-m.by

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ
### О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
### по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания жилого дома в г. Смолевичи

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | г. Смолевичи, ул. Советская, 125. Смолевичский райисполком, зал заседаний, 20.08.2015 г в 11-00 ч |
| 3 | **Продавец и его адрес** | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | **Лот №1 –** площадь 0,1500 га, кадастровый номер 624850100008000250 г. Смолевичи, ул. Ф. Скарины<br>**Лот № 2 –** площадь 0,1500 га, кадастровый номер 624850100008000036 г. Смолевичи, ул. И. Шамякина, д. 3 |
| 5 | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 7 | **Начальная стартовая цена** | Лот № 1 – 130 000 000 рублей<br>Лот № 2 – 130 000 000 рублей |
| 8 | **Условия аукциона** | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республике Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь;<br>В) наличие не менее двух участников |
| 9 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | Лот № 1 – гравийная дорога<br>Лот № 2 – гравийная дорога |
| 10 | **Условия оплаты** | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней со дня подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной стартовой цены на р/с 3641000000205 ЦБУ 621 филиала № 616 АСБ «Беларусбанк», г. Жодино, код 812, УНП 600014139, ОКПУ 04064735, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок») |
| 12 | **Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемым земельным участком** | Каждый четверг с 9-00 до13-00 |
| 13 | **Окончательный срок приема заявлений** | 14.08.2015 г. – 17.00 |

Затраты на организацию и проведение аукциона (изготовление землеустроительного дела, осуществление государственной регистрации создания земельного участка, публикация информационного сообщения) подлежат возмещению победителем аукциона.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу:** г. Смолевичи, ул. Подлесная, д.11, каб. № 14.

**Окончательный срок приема заявлений –** 14.08.2015 г. 17.00.

**Контактные телефоны (8-01776) 5-52-65, (8-01776) 5-53-42.**

**Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:**

- заявление на участие в аукционе по установленной форме;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков);
- физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения** | капитальное строение, инв. № 413/С-20675 (назначение – здание, специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака 2 25 01, наименование – цех минеральной воды), площадью 1540,2 кв. м, расположенное по адресу г. Свислочь, ул. Волковысское шоссе, 1Б. Составные части и принадлежности: пристройка Б1/к, л-2, терраса л-1. Элементы благоустройства: железобетонный забор, ворота металлические (2 шт.), калитка металлическая, покрытие из бетонной плитки, асфальтобетонное покрытие, электроснабжение, водопроводная сеть, канализация |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | кадастровый номер 425250100001002178 (назначение – земельный участок для размещения объектов иного назначения (для обслуживания здания цеха минеральной воды) 1 16 00) площадью 0,4150 га, расположенный по адресу: г. Свислочь, ул. Волковысское шоссе, 1Б |
| **Начальная цена продажи** | 6 986 000 000 (шесть миллиардов девятьсот восемьдесят шесть миллионов) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 349 300 000 (триста сорок девять миллионов триста тысяч) белорусских рублей |
| **Продавец** | Свислочский филиал Гроднооблпотребобщества, 231969, г. Свислочь, ул. Комсомольская, 6, тел. 3-50-22, факс 3-50-22 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32 |
| **Условия аукциона** | **Условия проведения аукциона:**<br>- вовлечение в хозяйственный оборот в течение 3 (трех) лет с момента заключения договора купли-продажи;<br>- запрет на отчуждение до выполнения условий договора купли-продажи;<br>- обращение победителя аукциона в течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка, но не позднее 3 (трех) месяцев со дня принятия решения о предоставлении земельного участка за государственной регистрацией права на земельный участок |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/сч для перечисления задатка** | Р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области БИК 153001739 УНП 500833225 |

***Аукцион состоится 8 сентября 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209.***

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**

**Последний день приема заявлений – 2 сентября 2015 г. до 15.00.**

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ
### О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
### по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания жилого дома в г. Смолевичи

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | г. Смолевичи, ул. Советская, 125. Смолевичский райисполком, зал заседаний, 10.09.2015 г в 11-00 ч |
| 3 | **Продавец и его адрес** | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | **Лот №1 –** площадь 0,1500 га, кадастровый номер 624850100008000215 г. Смолевичи, ул. Шамякина, 34<br>**Лот № 2 –** площадь 0,1363 га, кадастровый номер 624850100002001209 г. Смолевичи, ул. Е. Полоцкой, д. 12 |
| 5 | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 7 | **Начальная стартовая цена** | Лот № 1 – 130 000 000 рублей<br>Лот № 2 – 130 000 000 рублей |
| 8 | **Условия аукциона** | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республике Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь;<br>В) наличие не менее двух участников |
| 9 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | Лот № 1 – гравийная дорога<br>Лот № 2 – гравийная дорога |
| 10 | **Условия оплаты** | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней со дня подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной стартовой цены на р/с 3641000000205 ЦБУ 621 филиала № 616 АСБ «БеларусБанк», г. Жодино, код 812, УНП 600014139, ОКПУ 04064735, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок») |
| 12 | **Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемым земельным участком** | Каждый четверг с 9-00 до 13-00 |
| 13 | **Окончательный срок приема заявлений** | 04.09.2015 г. – 17.00 |

Затраты на организацию и проведение аукциона (изготовление землеустроительного дела, осуществление государственной регистрации создания земельного участка, публикация информационного сообщения) подлежат возмещению победителем аукциона.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу:** г. Смолевичи, ул. Подлесная, д. 11, каб. № 14.

**Окончательный срок приема заявлений –** 04.09.2015 г. 17.00.

**Контактные телефоны (8-01776) 5-52-65, (8-01776) 5-53-42.**

**Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:**

- заявление на участие в аукционе по установленной форме;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков);
- физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

БЕЛАРУСБАНК

**ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует о продлении срока размещения облигаций банка 175-177 выпусков, номинированных в иностранной валюте, по 10.08.2016.**

Изменения в эмиссионные документы указанных выпусков зарегистрированы департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 05.08.2015.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

**ОАО «Белхим»** сообщает о решении

**ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО ОТКРЫТОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ о выплате дивидендов за первое полугодие 2015 года:**

• Направить на выплату дивидендов 5% от чистой прибыли ОАО «Белхим», полученной по итогам работы за первое полугодие 2015 года в сумме 1 164 355 485 руб., что составляет 58 217 774 руб.

• Утвердить размер начисленных дивидендов за первое полугодие 2015 года на одну акцию в сумме 164,62 руб.

• Установить период выплаты дивидендов – до 25 августа 2015 г.

• Установить следующий порядок выплаты дивидендов:

акционерам – физическим лицам – путем зачисления на лицевые счета акционеров;

юридическому лицу – ГО «Белресурсы» – управляющая компания холдинга «Белресурсы» – путем перечисления на расчетный счет. УНП 100122846

## ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Республика Беларусь, 220007, г. Минск, ул. Московская, 14
Тел.: (+375 17) 309 15 15, (+375 29) 309 15 15, (+375 33) 309 15 15

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2015 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | за 30 июня 2015 года | за 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 317 689 | 237 525 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 2 512 714 | 2 779 223 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 261 245 | 362 123 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 528 799 | 51 045 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 7 663 648 | 6 474 299 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 9 149 | 638 760 |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | | - | - |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | | - | - |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 23 | 22 |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 475 691 | 489 815 |
| 13 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 24 903 | 28 353 |
| 14 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | 3 357 | 3 357,0 |
| 15 | Деловая репутация | | | - | - |
| 16 | Прочие активы | 1112 | | 165 161 | 142 645 |
| 17 | **ИТОГО активы** | **11** | | **11 962 379** | **11 207 167** |
| 18 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 19 | Средства Национального банка | 1201 | | 507 662 | 504 882 |
| 20 | Средства банков | 1202 | | 3 509 708 | 4 289 265 |
| 21 | Средства клиентов | 1203 | | 6 140 332 | 4 589 141 |
| 22 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 21 613 | 75 860 |
| 23 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 785 | 3 018 |
| 24 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 25 | Прочие обязательства | 1207 | | 304 471 | 263 120 |
| 26 | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **10 484 571** | **9 725 286** |
| 27 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 28 | Уставный фонд | 1211 | | 779 620 | 779 620 |
| 29 | Эмиссионный доход | 1212 | | 34 320 | 34 320 |
| 30 | Резервный фонд | 1213 | | 82 563 | 76 721 |
| 31 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 234 894 | 235 717 |
| 32 | Накопленная прибыль | 1215 | | 346 411 | 355 503 |
| 33 | Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации-банку | | | 1 477 808 | 1 481 881 |
| 34 | Доля неконтролирующих акционеров | | | - | - |
| 35 | **ВСЕГО собственный капитал** | **121** | | **1 477 808** | **1 481 881** |
| 36 | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **11 962 379** | **11 207 167** |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 01 января 2015 г. по 30 июня 2015 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2015 год | 2014 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 759 162 | 523 544 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 486 378 | 303 258 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 272 784 | 220 286 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 275 719 | 220 890 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 38 236 | 38 595 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 237 483 | 182 295 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | 338 | 5 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | (97 165) | (658) |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 273 797 | 32 426 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 307 054 | 151 654 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 51 588 | 31 143 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 265 631 | 224 402 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 16 849 | 16 887 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 149 291 | 72 554 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | | 46 129 | 18 184 |
| 17 | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **103 162** | **54 370** |
| | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | | - | - |
| | Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц | | | - | - |
| | **ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | | | **103 162** | **54 370** |
| | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации-банку | | | 103 162 | 54 370 |
| | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | | - | - |

Консолидированная финансовая отчетность банка в соответствии с НСФО на 1 июля 2015 в полном объеме размещена на сайте банка по адресу: www.vtb-bank.by.

**Председатель Правления** **В.В. Иванов**

**Главный бухгалтер** **М.В. Дудко**

**Дата подписания «30» июля 2015 г.** УНП 101165625.

■ На свежым паветры

# Верхні горад не апусцее

## Закрыццё сезона адзначым, але святкаваць не перастанем

**Гістарычны і культурны цэнтр сталіцы ў гэтым сезоне чарговы раз стаў пляцоўкай для выдатных (а галоўнае — папулярных) мерапрыемстваў. Прайшлі музычныя праграмы «Джазавыя вечары ля ратушы», «Класіка ля ратушы», што кожныя выхадныя выцягвалі мінчан з кватэр і запрашалі на візіт гасцей горада. Але на гэтым, на шчасце, штотыднёвыя святы не скончацца. Жнівень падрыхтаваў нам чарговую музычную праграму пад назвай «На біс».**



Верхні горад стаў класічным і любімым месцам адпачынку гараджан, а ў месяцы летняга музычна-турыстычнага сезона ён ператвараецца ў мнагалюднае свята — без відавочных падстаў, толькі таму, што мы жывём і ствараем мастацтва. Кожны дзень тут працуюць кіёскі з сувенірнай прадукцыяй, рашэннем Мінгарвыканкама ў выхадныя дні ў Верхнім горадзе народныя майстры, майстры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, вулічныя тэатры, музыканты і мастакі — кожны, хто датычны да вулічнага свабоднага мастацтва, могуць працаваць тут без платы падаткаў ці арэндных збораў. Акрамя іншага, па суботах і нядзелях гэта тэрыторыя становіцца пешаходнай зонай. Кожны творчы чалавек можа самавыявіцца тут — на пешаходнай зоне Верхняга горада.

Сёлета быў адзначаны своеасаблівы рэкорд: адзін з джазавых вечароў сабраў каля сямі тысяч слухачоў, у той час як летась колькасць гасцей не перавышала чатырох з паловай тысяч.

У жнівеньскія суботы адбудуцца чатыры канцэрты. Ужо сёння ансамбль «Мінск-класік» і квартэт драўляных духавых інструментаў «Рыўера» пад кіраўніцтвам Максіма Расохі выканае праграму шэдэўраў класічнай музыкі Іагана Штрауса, Жака Офенбаха, Антоніа Вівальдзі, Іагана Себасцьяна Баха і іншых.

15 жніўня сваю праграму прадставіць адзін з самых арыгінальных музычных калектываў краіны — Акадэмічны ансамбль песні і танца Узброеных сіл Беларусі. Яго **кіраўнік, заслужаны артыст Беларусі палкоўнік Уладзімір ВАРАПАЕЎ**, расказваючы пра будучы канцэрт, дадае, што ў кожнае сваё выступленне калектыў стараецца ўключыць нейкую іскрынку: «Мы закранём некалькі тэм, і ў першую чаргу матыў нацыянальнай культуры. Гэта будзе спектакль, дзе мы паспрабуем паказаць настрой, характар, культуру і прыгажосць нашага народа. Гэта адпаведнае гучанне, аранжыроўкі, нацыянальныя касцюмы і, зразумела, галасы выканаўцаў. Абавязкова мы закранём тэму Вялікай Айчыннай, усё ж такі 70-годдзе Перамогі. На гэты момант за плячыма ў нас 114 канцэртаў, як у Беларусі, так і за яе межамі, і менавіта гэтую тэму ў кожнай праграме мы раскрываем шырока і глыбока. Мы паказваем і матывы сучаснай беларускай арміі: хуткасць, сілу, энергію, маладосць з дапамогай, напрыклад, сучаснай харэаграфіі з элементамі хіп-хопа, брэйкданса, таму што гэта сілавыя, валявыя пастаноўкі. Заключнай будзе масавая кампазіцыя, што пакажа настрой, свята і запросіць да ўдзелу гледачоў».

22 жніўня наведвальнікаў чакае выступленне Дзяржаўнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі», мастацкім кіраўніком якога з'яўляецца Валянціна Гаявая. Будучыя выступоўцы ўжо пачалі рэпетыцыі. А ў апошнюю суботу і месяца, і лета — 29 жніўня — выступіць унікальны шырынёй свайго рэпертуару беларускі калектыў — канцэртны аркестр «Няміга» (галоўны дырыжор — Аляксандр Сасноўскі), што выканае папулярную класічную музыку і сучасныя хіты. Для канцэрта таксама будзе падрыхтавана танцавальная праграма.

Кожны суботні канцэрт праграмы «На біс» будзе пачынацца а восьмай гадзіне вечара пасля заканчэння службы ў кафедральным саборы. Увогуле ж мерапрыемствы летняга музычна-турыстычнага сезона кожную суботу стартуюць апоўдні.

Жнівеньскія нядзелі таксама прадставяць асобную праграму — цыкл канцэртаў духавых аркестраў, што будуць пачынацца а 15-й гадзіне. Заўтра, 9 жніўня, серыя пачнецца з выступлення духавога аркестра 56-га асобнага палка сувязі, 16 жніўня праграма працягнецца канцэртам аркестра Мінскага сувораўскага ваеннага вучылішча, 23 жніўня — духавым аркестрам 120-й ваеннай брыгады, у перадапошні дзень месяца сыграе аркестр роты ганаровай варты Ваеннай камендатуры Узброеных Сіл Беларусі.

**Сёлета быў адзначаны своеасаблівы рэкорд: адзін з джазавых вечароў сабраў каля сямі тысяч слухачоў, у той час як летась колькасць гасцей не перавышала чатырох з паловай тысяч.**

**Намеснік начальніка ўпраўлення, начальнік аддзела ўстаноў культуры і культурна-асветніцкай работы ўпраўлення культуры галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі Мінгарвыканкама Сяргей МЯДЗВЕДЗЕЎ** сказаў, што пакідаць Верхні горад пустым ужо нават неэтычна: «З задавальненнем рэзюмую, што першыя месяцы летняга музычна-турыстычнага сезона прайшлі паспяхова і дзякуючы нашым партнёрам і зладжанай працы ўсіх службаў і падраздзяленняў Мінгарвыканкама адбыліся праекты «Джазавыя вечары ля ратушы» і «Класіка ля ратушы». У нас яшчэ шмат цёплых дзён наперадзе, і мы не маглі проста пакінуць прывычнае для гасцей і турыстаў месца, пра якое ўжо шмат размаўляюць. Мы не адпускаем гэты час толькі на водкуп мерапрыемстваў летняга музычна-турыстычнага сезона, а ствараем яшчэ адзін музыкальны праект, які будзе, як нам здаецца, мець не меншы поспех».

Музычны турыстычны сезон працягнецца і ў верасні, але будучыя праекты пакуль невядомыя. Традыцыйна закрыццё сезона адбудзецца разам з Днём горада, які сёлета будзе адзначацца 12 верасня. У гэтую суботу мерапрыемствы ў гістарычным цэнтры сталіцы будуць тэматычна звязаны са святам. Але галоўная фішка ў тым, што намінальна закрыццё сезона адбудзецца, а штотыднёвае свята працягнецца.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■ «ТэАрт-2015»

# ГУЛЬНЯ З КЛАСІКАМІ

## Людзі і фрыкі: тэатр іх толькі паказвае

**Жыццё абяцае падарункі, кажаш сабе ў разгар «мёртвага сезона», калі культурнае лета ў вялікім горадзе абмяжоўваецца вечаровымі шпацырамі. А вось пра тое, каб выхад «у людзі» быў напоўнены яшчэ і духоўным сэнсам, застаецца марыць да восені. Цяпер гэта будзе рабіць прасцей, бо мары аформіліся, сталі больш канкрэтнымі і ад таго яшчэ больш прывабнымі. Усё проста: абвешчана праграма міжнароднага тэатральнага фестывалю «ТэАрт», які стартуе ў Мінску напрыканцы верасня. І яна абяцае...**

Па-першае, абяцае зноў знаёмства з абліччам сучаснага сусветнага тэатра, які (вось жа і ёсць падарунак) сам прыязджае да нас — дзякуй мецэнатам, спонсарам і міжнародным партнёрам, якіх у арганізатара, Цэнтра візуальных і выканальніцкіх мастацтваў «Арт Карпарэйшн», становіцца больш. І па-другое: магчымасць паглыблення ў тэатр беларускі, на які можна паглядзець ў кантэксце тэатра сусветнага, але з іншага пункта погляду, прыглядзецца да тых сіл і асоб, якія імкнуцца не проста рабіць спектаклі для людзей, а, хутчэй, ствараць людзей праз спектаклі. Была трывога, што менавіта гэты беларускі блок «ТэАрта» будзе пакрысе адыходзіць на другі план (маўляў, ужо пазнаёмілі з іншым беларускім тэатрам, адкрылі імёны нашых модных у іншых краінах драматургаў, і можна расслабіцца, сцішыць хаду). Але гэтага не адбываецца. Якраз наадварот. Таму што сёлета беларуская праграма выглядае не дадаткам, а самастойнай цікавай часткай, даволі важкай (больш за 10 спектакляў), з мноствам прыцягальных і нашумелых у краіне назваў. І гэтая частка арганічна ўпісана ў агульную міжнародную праграму. Што зноў-такі зразумела: айчынныя тэатральныя гурманы чакаюць усё ж менавіта яе.

Нездарма чакаюць. Таму што сёлета ў нас будзе магчымасць паразважаць пра тое, што ёсць тэатр як люстэрка жыцця. І якога жыцця: таго, калі была створана п'еса, ці таго, што яна дае магчымасць зразумець зараз. Першы ж агляд міжнароднай праграмы дае адкрыццё: шмат назваў класічных, шмат адсылак да класікі і класікаў тэатра. Што так? Няўжо няма новых тэм ці з'яў у жыцці, якія варта адлюстроўваць? І новай можа быць толькі форма? Не ўсё так проста — разумееш, калі вывучаеш аўтараў пастановак і анатацыі спектакляў. Тэатр — гэта прастора пазачасавая ці такая, дзе розныя часы сплятаюцца, дзе і ёсць той самы эзатэрычны выхад у паралельную прастору, калі пунктам адліку падарожжа па ёй становіцца сам чалавек. Глядач. Артыст. Аўтар.

Тэатр — не ілюзія, не цырк, дзе трукі ствараюцца дзеля заварожвання. Але вас імкнуцца зачараваць эмоцыі праз вобразы, нават калі ёсць у падыходах да працы даволі шмат ад цыркавых практык і прыёмаў. Але яны працуюць на ідэю. Так стварае, напрыклад, Даніэль Фінцы Паска, вядомы па працы ў Цырку дзю Салей і Цырку Элуаз. У нас будзе магчымасць пабачыць яго апошні спектакль «Донка» («Пасланне Чэхаву»). Гэтая пастаноўка нарадзілася як сумесны праект разам з Міжнародным тэатральным фестывалем імя Чэхава. Натуральна, чэхаўская тэма першасная. Але тут варта чакаць не столькі Чэхава, колькі адчування яго твораў, герояў. Адчування найперш персанальнага, Фінцы Паска, у якога свет Чэхава падаецца праз вобраз донкі — вуды са званочкам, які звініць, калі рыбка заглынула прынаду. А Чэхаў любіў рыбалку. Можа, таму падаецца, што яго героі нібыта заглынаюць прынаду, якую ім падкідвае аўтар. Дзіўны Чэхаў і тым, што актуальны ў тэатры, нягледзячы на тое, што мяняюцца стагоддзі. Іншы час — гэта ўсяго толькі іншыя магчымасці паказаць тую самую актуальнасць, якая зачароўвае. Фінцы Паска і не ўтойвае, што сваю зачараванасць падкрэслівае праз цырк, які можа заварожваць асаблівым чынам. Што сказаў бы Чэхаў? А што скажуць нашы знаўцы Чэхава? (Будзе магчымасць паразважаць пра Антона Паўлавіча ў беларускай праграме.)



Так выглядае «Пасланне Чэхаву».

Яшчэ адзін герой класічнага мінулага, з якім нам абяцаюць сустрэчу — Анегін. Паводле Пушкіна — пушкінская эпоха мінула, а яго героі засталіся. На гэтым робіць акцэнт рэжысёр Цімафей Кулябін і Навасібірскі дзяржаўны акадэмічны тэатр «Чырвоны факел». Анегін застаўся, падобны герой ёсць у XXI стагоддзі; можа быць, выглядае інакш, але матывы паводзінаў і ўчынкі, расчараванні і пошукі ўласцівы чалавеку не толькі ў «пушкінскую эпоху».

Тое ж самае можна зразумець пра герояў Аляксандра Астроўскага. Прычым актуальнымі іх лічаць у Венгрыі. Тэатр «ТАР» з Будапешта пакажа пастаноўку рэжысёра Вільмаша Вайдаі «Даходнае месца». Дзіўна, што драматургам пазначана Кінга Кестэлы. Ужо цікава: значыць, тэкст Астроўскага перапрацаваны пад ідэю стваральнікаў, якія хацелі паразважаць пра карумпаваных дзяржаўных чыноўнікаў. Толькі героі Астроўскага з нашага часу і існуюць у іншых рытмах і гуках. Жыццё іх і лёсы пры гэтым мала мяняюцца. Вось у чым сіла класікаў — бачанне таго, як абставіны ўплываюць на людзей і ствараюць іх характары.

«Жыццё і лёс». Увасабленне рамана Васіля Гросмана на тэатральнай сцэне ажыццявіў славуты рэжысёр Леў Додзін і пецярбургскі Малы драматычны тэатр — тэатр Еўропы. Класіка літатаруты XX стагоддзя, і не важна, дзе раман быў створаны. Чалавек з савецкай рэчаіснасці часоў Сталіна робіць свой чалавечы выбар: загінуць дзеля праўды ці пакаяцца ў тым, чаго не было. Чалавек перад выбарам — тэма наогул вечная. Гістарычны фон і канкрэтныя акалічнасці толькі гіпербалізуюць і ўзмацняюць яе, дазваляючы адчуць тую мяжу, калі сумленны чалавек можа ў вачах іншых стаць ворагам народа.

А сама з'ява — «вораг народа» — не толькі савецкая. «Вораг народа» — спектакль паводле Генрыка Ібсэна прывозіць нямецкі Театр «Schaubuhne Berlin». Пастаноўка Томаса Астэрмаера на сацыяльную тэму. Але герой таксама аказваецца перад асабістым выбарам: быць шчырым і паслядоўным у адстойванні праўды, але пры гэтым страціць давер і стасункі з ншымі людзьмі, якія хочуць жыць спакойна і стабільна ў свеце, дзе ўсё прадаецца і купляецца.

«Як вам гэта спадабаецца?» — быццам абураецца дасціпны глядач. Нават назвы спектакляў нібыта звязаны паміж сабой і дазваляюць убачыць карціну чалавечага жыцця з усімі яго праблемамі і пачуццямі. І ўсе яны даўно вядомыя і абазначаныя. Вельмі даўно. Такім чынам: Шэкспір, спадарства. Спектакль «Як вам гэта спадабаецца» Тбіліскага акадэмічнага тэатра імя Катэ Марджанішвілі ў пастаноўцы Левана Цуладзэ. Пра тое, як жыццё можа нечакана перамяніцца ў адно імгненне. Яшчэ адна вечная тэма не толькі ў тэатральным, але наогул у чалавечым свеце. І вось чаму так запатрабавана класіка ў тэатры: рэжысёры бачаць у ёй не прывіды мінулага, не захапляльны антураж мінулых эпох, а самога чалавека, звяртаючы ўвагу на тое, мяняецца ён ці не і чаму. Сучасны тэатр ствараецца ўсё ж для сучасных людзей. А яшчэ ён стварае людзей.

Аўтары такіх спектакляў — зробленых з думкай і па-мастацку (каб перавярнуць душу сучаснага гледача) — могуць стаць сучаснымі класікамі. Між іншым, менавіта так успрымаюць у Мінску рэжысёра Алвіса Херманіса, спектаклі якога не першы год у нас паказваюцца, і пры гэтым хочацца яшчэ. Сёлета нам прапануюць «Латышскае каханне» ў выкананні Новага рыжскага тэатра. Рэальнае каханне рэальных людзей — гісторыі збіраліся стваральнікамі, акцёрамі. Але яны пра тое, што таксама вечнае для людзей — каханне, жаданне якога — не залежыць ад часоў і тэрыторый (хоць у гэтым выпадку латышскае).

І яшчэ пазатэрытарыяльнае — «Танец Дэлі». Для аматараў творчасці Івана Вырыпаева. І рэжысёра Дзмітрыя Ваўкастрэлава (таксама вядомага беларускаму гледачу). Два гэтыя прозвішчы — ужо выбуховае спалучэнне. Адметна, што пастаноўку ажыццявілі ў Санкт-Пецярбургскім тэатры юных гледачоў імя Бранцава. Зрэшты, можа быць, для юных, якія шукаюць свой шлях, вельмі актуальна паглядзець: пра сэнс жыцця і што нараджае ў ім няшчасці, як іх абмінуць і атрымаць гармонію і ўбачыць прыгажосць жыцця?

Яна ёсць. і пацверджанне гэтаму было і будзе. У прыватнасці, у кіеўскага Цэнтра сучаснага мастацтва «ДАХ» і рэжысёра Улада Троіцкага ёсць сваё разуменне таго, як усё гэта здабываецца. Толькі трэба паглядзець іх «Dakh Daughters Band», тэатральна-музычны перформанс, дзе ёсць адсылкі і да Шэкспіра, і да Іосіфа Бродскага (і іншых), і фальклор, і сучасныя хіты. І ўсё спалучаецца дзякуючы сямі актрысам з музычнымі інструментамі.

І яшчэ пра любоў і час. Ад італьянцаў. «Архідэі» (Кампанія Піпа Дэльбона). Спроба спыніць час, пераасэнсаваць сутнасць любові, якая яго напаўняе, без якой нічога не мае сэнсу — нават прыгажосць архідэй можа аказацца штучнай...

Пра гармонію цела і духу разважаюць стваральнікі спектакля «Стары Монк» — музычны тэатр «Лод» з Бельгіі і Тэатр Відзі-Лазан са Швейцарыі. Раяль, Тэланіус Монк іграе, але аддаецца музыцы ўвесь, пачынае танчыць...

Што значыць танец у тэатры і як ён можа стаць асобным сродкам драматычнага выяўлення, мы паглядзім таксама. І гэта будзе сапраўдная «MatchAtria». Спектакль-інсталяцыя, ці інсталяцыя-танец, тонкая па-японску. І сучасная, як Японія. Сумесны праект японцаў Юі Кавагуці, Есімаса Исібасі і Ільы Фантэйна з Германіі. Штосьці мастацка-тэатральна-танцавальнае. Сінтэз, мэта якога адчуць сапраўднае біццё сэрца. Сучасны тэатр яшчэ глядзіць углыб чалавека, адчувае яго рытмы, каб размаўляць з ім на мове сэрца. Бо гэта той самы рытм, які і вызначае жыццё ў людзей самых розных краін. І адчуваем мы яго аднолькава. Цуд. Як і сучасны тэатр, які яднае. Паглядзім?

**Ларыса ЦІМОШЫК.** *tsimoshyk@zviazda.by*



«Трыццацігадовы ўзрост». Аўтар — Пан Вэй.

## ДЗВЕ ВЫСТАВЫ, ШТО ВАРТА ПАБАЧЫЦЬ

**Толькі тыдзень быў адведзены мінчанам, каб убачыць 12-ю Нацыянальную Усекітайскую мастацкую выставу.**

Яе адкрыццё адбылося ў апошні дзень ліпеня ў рамках падпісання дагавора аб супрацоўніцтве паміж Канфедэрацыяй творчых саюзаў Беларусі і Асацыяцыяй культуры і мастацтва Кітайскай Народнай Рэспублікі.

Галерэя «Ракурс» Нацыянальнай бібліятэкі змясціла ў сабе 23 працы кітайскіх мастакоў розных напрамкаў, створаных за апошнія пяць гадоў, што могуць даць цэласнае ўяўленне пра сучасны стан кітайскага выяўленчага мастацтва. У самім Кітаі Усекітайская мастацкая выстава мае нязменны аўтарытэт і з'яўляецца лідарам у колькасці і ўзроўні экспанатаў. Менавіта яна прадстаўляе апошнія тэндэнцыі і зрэз таго, што хвалюе аўтараў. Сваю гісторыю выстава вядзе з 1949 года і праводзіцца кожныя пяць гадоў. На тое, каб пабачыць экспазіцыю, засталося два дні. Заўтра, 9 жніўня, яна закрываецца.

У гэты ж час Нацыянальны мастацкі музей 3 жніўня адкрыў персанальную выставу Ашота Хачатрана, што жыве і працуе ў Санкт-Пецярбургу (у гэтым горадзе адбылася і першая выстава мастака), а нарадзіўся, правёў дзяцінства і юнацтва ён у Арменіі. Арарацкая даліна стала першым натхненнем будучага жывапісца, у якога сёння за плячыма пятнаццаць толькі персанальных выстаў.

Экспазіцыя «Падарожжа ў артпрастору Ашота Хачатрана» ў Нацыянальным мастацкім музеі налічвае сорак палотнаў, што ствараюць рэтраспекцыю-эвалюцыю стылю майстра ў любімых ім жанрах — пейзаж, нацюрморт, партрэт, кожны з якіх створаны з прыродным адчуваннем колеру.

Выстава працягнецца да 7 верасня.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■ На вялікім экране

# Не Каламбія, але прадстаўляем

## Каралі кінематографа і наша новая камедыя

**Час адпачынкаў не адмяняе традыцыі глядзець добрае кіно і планаваць будучыя сеансы. Ажно тры жнівеньскія праграмы падрыхтаваў музей гісторыі кіно: класічныя акцёры сусветнага кінематографа і фільмы, створаныя нашымі аніматарамі. Да таго ж стала вядома, што беларуская карціна «Гараш» Андрэя Курэйчыка рыхтуецца да прэм'еры ў мінскім пракаце ў канцы верасня.**

**1.** Словамі аўтарытэтнага англійскага крытыка, «у Галівудзе былі, ёсць і будуць толькі дзве вялікія «зоркі» — Грэта Гарба і Чарлі Чаплін. А іншыя, на першы погляд не менш вядомыя і таленавітыя, былі толькі паддданымі ў свіце гэтых некаранаваных каралёў экрана». Дарэчы, і сама загадкавая шведка шчыра любіла фільмы вядомага коміка і марыла ў іх зняцца. Але «ў яго былі свае актрысы».

Да канца жыцця любімым фільмам са сваім удзелам Гарба лічыла камедыю «Ніначка», знятую Эрнстам Любічам. Але ў гісторыю кіно і студыі Metro-Goldwyn-Mayer яна ўвайшла як узор антычнай прыгажосці і выканальніца роляў ракавых жанчын — гэта фільмы «Спакусніца», «Плоць і д'ябал», «Таямнічая дама», «Натхненне»... Стварэнню прывабнага сваёй загадкавасцю іміджу спрыяў характар актрысы: яна была замкнутай, пазбягала журналістаў і не давала інтэрв'ю, не адказвала на лісты паклоннікаў, любіла адасабленне і адзінокія шпацыры па Нью-Ёрку, абмяжоўвала кола сваіх сяброў. За гэта яе назвалі «шведскім сфінксам», «нардычнай прынцэсай».

Рэтраспектыва Музея гісторыі кіно, прымеркаваная да 110-годдзя з нараджэння каралевы экрана, пачалася 5 жніўня з першай буйной ролі актрысы — чорна-белага нямога фільма «Бязрадасны завулак», створанага яшчэ ў «дагалівудскі» перыяд. Прадоўжылася праграма той самай «Спакусніцай», у якой пачаў складвацца імідж Грэты Гарба, заўтра пройдзе паказ карціны «Плоць і д'ябал». У праграму рэтраспектывы, што будзе праходзіць цэлы жнівень па серадах, пятніцах і нядзелях, уваходзяць самыя славутыя і важныя для кар'еры актрысы карціны. Гэта «Ганна Крысці» — дэбют Гарба ў гукавым фільме. Дарэчы, яна стала адной з нямногіх, хто бязбольна перайшоў у кіно новай эпохі. Гледачу спадабаўся яе нізкі з хрыпатой голас, што стаў яшчэ адным моцным інструментам для стварэння шчырых, глыбока драматычных і трагедыйных роляў.

**Наведванне паказаў у Музеі гісторыі кіно можна сумясціць з азнаямленнем са жнівеньскай выставай «Беларускі кінематограф 20-30-х гадоў XX стагоддзя ў кінаплакаце»**

«Мата Хары», «Гранд-гатэль», «Каралева Хрысціна», «Ганна Карэніна», «Пакарэнне», «Каміла» (па п'есе Дзюма-сына «Дама з камеліямі»), «Ніначка» — поўны спіс класічных фільмаў з непараўнальнай нардычный прынцэсай, якія можна будзе пабачыць у Музеі гісторыі кіно.

**2.** Па суботах, пачынаючы з сённяшняга дня, музей пакажа чатыры фільмы, дзе здымаўся легендарны егіпецкі акцёр Амар Шарыф, што памёр у мінулым месяцы ва ўзросце 83 гадоў. Пасля яго першай ролі на англійскай мове ў карціне «Лоўрэнс Аравійскі» Дэвіда Ліна (што да гэтых часоў лічыцца адным з найкаштоўнейшых фільмаў гісторыі амерыканскага кіно), з якой сёння пачнецца рэтрапраграма, Шарыф стаў вядомым на ўвесь свет. У музеі таксама можна будзе пабачыць стужку «Маерлінг» Тэрэнса Янга, дзе акцёр сыграў разам з Катрын Дэнёў і выканаў ролю кронпрынца Рудольфа, наследніка аўстра-венгерскага трона; самы касавы фільм 1968 года «Смешная дзяўчынка» рэжысёра Уільяма Уайлера («Бен-Гур», «Рымскія канікулы»), дзе пару Шарыфу склала Барбара Стрэйзанд. У апошнюю суботу жніўня адбудзецца паказ галівудскай экранізацыі забароненага ў СССР рамана Барыса Пастэрнака «Доктар Жывага», дзе акцёр выканаў галоўную ролю.

**3.** Музей гісторыі кіно ў жніўні таксама прапануе нам выкарыстаць рэдкую магчымасць убачыць беларускую анімацыю апошніх гадоў. Сумесна са студыяй анімацыйнага кіно «Беларусьфільма» і Беларускім дзяржаўным архівам кінафотафонадакументаў была створана праграма з кароткіх мультфільмаў — «Рыбка па імені Нельга» і «Пра вала» Аляксандра Ленкіна, «Мышка» Уладзіміра Пяткевіча, «Песня жаўрука» Таццяны Кубліцкай, «Ронда-капрычыёза» і «Дурная пані і разумны пан» Ігара Воўчака, частка серыі фільмаў пра гісторыю стварэння гербаў беларускіх гарадоў «Аповесць мінулых гадоў» і іншыя. Праграма, у якую ўваходзяць беларускія анімацыйныя фільмы 2012-2013 гадоў, будзе паказвацца па суботах і нядзелях а палове першай.

**4.** З'явіўся выклік кінематографу дзяржаўнай кінастудыі з боку сцэнарыста і рэжысёра Андрэя Курэйчыка — стала вядома, што яго камедыя «Гараш», знятая за ўласны невялікі бюджэт, была паказана вузкаму колу сяброў у кватэры рэжысёра. Гэты 45-хвілінны фільм пра дэпартаванага са Злучаных Штатаў беларуса, што ідзе працаваць у аўтамайстэрню ў Шабанах, быццам пра беларускія рэаліі і з тыпова беларускімі персанажамі. Адну з галоўных роляў тут сыграў саліст музычнага гурта Neuro Dubel Аляксандр Кулінковіч.



Амар Шарыф і Барбара Стрэйзанд у фільме «Смешная дзяўчынка».

Фільм «Гараш» не патрабуе дзяржаўнай дапамогі і раскручвання складанай структуры вялікай кінастудыі. Пракат карціны, што зараз знаходзіцца ў стадыі постпрадакшн, запланаваны на канец верасня, тады і паглядзім, ці мае такі шлях нацыянальнага кінематографа патэнцыял.

**5.** Наведванне паказаў у Музеі гісторыі кіно можна сумясціць з азнаямленнем са жнівеньскай выставай «Беларускі кінематограф 20-30-х гадоў XX стагоддзя ў кінаплакаце», што складаецца з трыццаці пяці поўнафарматных і поўнакаляровых рэпрынтаў кінаплакатаў да беларускіх фільмаў 1926—1940 гадоў.

У тыя часы ў жанры кінаплаката ў СССР працавалі вядомыя мастакі-графікі, да таго ж плакат быў галоўнай крыніцай уяўленняў пра фільм (перад праглядам). Цікава, як мастакі ўвасабляюць цэлую кінакарціну ў адной выяве, памятаючы пра тое, што плакат павінен яшчэ і прывабліваць гледачоў у кіназалу. Знамянальны прыклад, калі амерыканскія пракатчыкі італьянскага неарэалістычнага фільма «Выкрадальнікі веласіпедаў» пра цяжкія беспрацоўныя дні пасляваеннага Рыма, каб прывабіць гледачоў, змясцілі на плакаце выяву прыгожай дзяўчыны на веласіпедзе. Плакат — гэта і рэклама, і мастацтва. У выстаўцы можна ўбачыць унікальныя ўзоры на беларускай мове да фільмаў «Кастусь Каліноўскі», «Песня вясны» і «Джэнтльмен і певень».

Экспазіцыя стала вынікам шматгадовай працы і дэманструецца, па словах музейшчыкаў, упершыню за семдзесят пяць гадоў. Выстава працягнецца да 30 жніўня.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

# У ПАЛЕСКАЙ «АМАЗОНІІ»

**Прыпяцкае Палессе трэба бачыць. Чуць і ўдыхаць. Унікальнае месца на поўдні краіны. Вада, ландшафт, жывёлы, птушкі, расліны... І палешукі. Што ні персона, то фант, і пра кожнага столькі баек пачуеце! Але галоўнае, што не толькі байкі з паданнямі. Сама Прырода тут з чалавекам гаворыць — і вецер, і лісце, і рака... Прыпяцкае Палессе раскінулася абапал ракі Прыпяць. Тут шмат балот, лясоў, пойма з вялікай разнастайнасцю жывёл, птушак і рыб, некаторых з якіх больш нідзе не сустрэць. Усё гэта з 1969 года — ландшафтна-гідралагічны запаведнік, а з 1996-га — Нацыянальны парк «Прыпяцкі», у якім мы нядаўна пабывалі.**


Сузіраць рачную прыгажосць лепей на цеплаходзе.

## Запаведная тэрыторыя

У насельніцтва, як правіла, неаднназначнае стаўленне да існавання запаветных зон, многія злуюцца таму, што ўстанаўліваюцца шлагбаумы, якія абмяжоўваюць праезд у лясны масіў (дарэчы, праезд, а не яго наведванне), што рэгламентуецца адлоў рыбы, што трэба плаціць за паляванне і г.д. Аднак хіба іначай можна захаваць усё гэта? Не ўсе хочуць разумець...

Развіваць экатурызм на Прыпяці пачалі менавіта ад моманту стварэння нацыянальнага парку. За 20 гадоў кіраўніцтва і персанал прыклалі нямала намаганняў, каб трымаць усю гэту гаспадарку ў парадку, каб тысячы і тысячы айчынных і замежных турыстаў пабачылі Прыпяць, пойменную дуброву, аленя ці дзятла жыўцом, а не на фотаздымку. Для гэтага тут распрацаваны спецыяльныя экалагічныя туры.

— Тут, у вёсцы Ляскавічы, дзе цяпер знаходзіцца адміністрацыйны корпус, я нарадзіўся, рос, але не задумваўся, што ў нас нейкая асаблівая тэрыторыя, — кажа **генеральны дырэктар Нацыянальнага парку «Прыпяцкі» Сцяпан БАМБІЗА.** — Раней была натуральная запаведная зона: толькі напрыканцы 1960-х у вёсцы з'явілася электрычнасць, першая дарога — у 1976-м! Сюды на легкавіку нерэальна было даехаць. У бок Жыткавіч, Петрыкава дарога наогул была непраходнай, памятаю, як аўтобус бульдозерам выцягвалі...



Апошнія гады — новая старонка ў гісторыі краю. Афіцыйны статус запаведніка — гэта велізарныя магчымасці для далейшага развіцця турызму, дзякуючы развіццю сеткі дарог, узвядзенню гасцініц, дамоў адпачынку і г.д. Мы выконваем усе належныя паказчыкі, каб трымаць марку. У планах — развіццё паляўнічай гаспадаркі, адкрыццё велізарнай фермы па гадоўлі аленяў...


Пясчаныя косы ўздоўж Прыпяці.

Шмат праводзім і прыродаахоўных мерапрыемстваў. Толькі паглядзіце, якім засушлівым выдалася ў гэтым годзе лета на Гомельшчыне — ніводнага дажджу за два месяцы! Адсюль пажары ў лясах, увядзенне забароны на іх наведванне. У пачатку ліпеня штодня сваімі сіламі і не толькі ліквідоўвалі па некалькі ўзгаранняў...

## Міма плёсаў ды старыц

...Працяглая адсутнасць дажджоў адбілася і на стане Прыпяці — моцна абмялела рака. Але дзякуючы такой недарэчнасці нам удалося пабачыць прыгожыя пясчаныя косы падчас воднай прагулкі на «казанцы». Звычайна на гэтай маторнай лодцы палююць на рыбу. Калі рыбалка ў ваш план не ўваходзіць, то сузіраць рачную прыгажосць лепей на цеплаходзе. Іх у нацпарку пяць: «Кірыла Тураўскі», «Паланез», «Лань», «Лось» і для паромнай пераправы — «Зубр».

— Цеплаход рухаецца вельмі павольна, — расказвае **начальнік аддзела турызму Канстанцін ЕЎЛАШ.** — Кірунак маршруту — уніз па рацэ. Цеплаход «Кірыла Тураўскі» прышвартаваны ў затоцы паблізу гасцініцы «Над Прыпяццю», адкуль і пачынае свой шлях. «Зубр», «Лань» і «Лось» адпраўляюцца з вёскі Дарашэвічы, дзе знаходзіцца прыстань. Цягам гадзіны можна ўбачыць 20 км ракі з яе плёсамі, косамі, залівамі, старыцамі, высокімі і спадзістымі берагамі...


Егер Васіль САВІЧ швартуе «казанку».

**Егер Васіль САВІЧ** падвёз нас крыху бліжэй да берага, каб мы змаглі ацаніць неверагодную для яго вышыню (ну дзе яшчэ можна ўбачыць раку, чый бераг з аднаго боку — цалкам спадзісты, а з другога — як пяціпавярховы дом!). Сцішыўся матор, мы крыху пастаялі, але завесціся не здолелі — селі на мель... Васіль Яфімавіч узяў вясло і пачаў адштурхоўвацца ад мелкаводдзя... «Я працую егерам у нацпарку з 2003-га, — тлумачыць ён, пакуль рухавік маўчыць. — Гэта і ахоўныя мерапрыемствы, і паляванні на аленя, лася, зубра, казулю, дзіка, і рыбалкі, якія павінны праводзіцца ў прысутнасці егера і з адпаведнай пуцёўкай на руках... Эх, як абмялела... Даўнавата такога не было... Але ж адновіцца — з асеннімі дажджамі, дый крыху Гарынь падзеліцца... Рачная вада — не марская, цёмная, а каб была зусім празрыстая, убачылі б і шчупака, і судака, і ляшча, і плотку, і сама — 37 відаў рыб на Прыпяці... Самая рыбная рака Беларусі!


Начальнік аддзела турызму Канстанцін ЕЎЛАШ.


А берагі тут высокія...

Невялічкая прагулка на баржы пакінула не менш станоўчых эмоцый. Здаецца, ты стаіш, а наваколле паціху рухаецца. Прыгажосць...

Пасля прагулкі рачной нас чакала пешая — па дарозе здароўя, якая цягнецца ўздоўж самага высокага берага. Месцамі нават страшна глядзець уніз, але не глядзець немагчыма — вунь чапля на ваду села! Вяртаючыся назад, да парома, праходзім міма двух прыгожых катэджаў. Першы разлічаны чалавек на дваццаць, другі — на крыху меншую кампанію. Ёсць яшчэ лазня, а на першым паверсе таго катэджа, што паболей, — прыгожая тэраса, дзе можна зладзіць шыкоўную ўрачыстасць. Непадалёк — альтанка для гатавання шашлыкоў.



**Калі ехаць з Дарашэвіч у бок вёсак Хлупіна ды Перарова, можна трапіць на гравійную дарогу, паабапал якой — пойменная дуброва. Рэдкая з'ява, але на тэрыторыі нацпарку некалькі такіх участкаў.**

**Багата тут і арэшніку, і іншых дрэў, але дуб пануе. Вясной усю гэту плошчу залівае, дубы стаяць «па пояс» у вадзе, дарога знікае, і здаецца, што нагі чалавека тут не бывае і быць не можа.**

## Там, дзе крыж расце

За 50 км ад Ляскавічаў — Тураў, сэрца Палесся, адзін са старажытных гарадоў Кіеўскай Русі. Сёння — невялікі гарадок з самабытнай гісторыяй.

На паўднёвым захадзе, на Замкавай гары, установлены сучасны помнік паэту, філосафу, асветніку і прапаведніку Кірылу Тураўскаму. На паўночным захадзе ад гэтай гары размяшчаюцца Барысаглебскія могілкі, дзе ў XII стагоддзі быў Барысаглебскі манастыр (у адной з яго вежаў жыў Кірыла Тураўскі). У старой частцы могілак можна пабачыць каменны крыж з нявострымі канцамі — ён, як лічаць мясцовыя жыхары, пакрысе расце!

Са старажытнага гарадзішча дарога вядзе на ўсход, у цэнтр Турава, дзе ў набярэжным і гарадскім парках установлены помнікі салдатам-вызваліцелям і жыхарам, што загінулі падчас Вялікай Айчыннай. У цэнтры — мемарыяльны знак, прысвечаны тысячагоддзю Турава.

— У 1993 годзе паставілі сяміметровы крыж візантыйскай формы, — расказвае **спецыяліст па турызме Таццяна КУРБАКОВА.** — На адной з цэнтральных вуліц мы з вамі бачым пабудаваную ў 1810 годзе Усіхсвяцкую царкву. З правага боку ад увахода ў царкву і ад алтара — каменныя крыжы, прадмет культавага пакланення праваслаўных хрысціян. Дагэтуль жывая легенда, нібыта гэтыя крыжы прыплылі супраць цячэння па Дняпры і Прыпяці з Кіева і спыніліся ля горада. Таксама на тэрыторыі царквы ўстаноўлены помнік славутаму дзеячу Канстанціну Астрожскаму...




Калі ёсць жаданне ўсё гэта ўбачыць на свае вочы, можна прыязджаць і спыняцца непасрэдна ў Тураве, дзе ў мінулым годзе нацыянальны парк рэканструяваў эколага-асветніцкі цэнтр і адкрыў гасцініцу з адна- і двухмеснымі нумарамі «стандарт», «паўлюкс» і «люкс». Чысціню і камфорт ўжо ацанілі больш за тысячу гасцей.

Прыязджаюць сюды і турысты з Расіі, Украіны. Любяць назіраць за нашай жывой прыродай галандцы. Не так даўно група замежных турыстаў цікавілася некалькімі відамі птушак — удодам, дзятлам, жуланам, салаўём, варакушкай, чорным буслом... Дарэчы, некаторыя віды птушак можна пабачыць і падчас экскурсіі па экалагічнай дарозе да 800-гадовага цар-дуба, самага старога і буйнага ва ўсім Прыпяцкім Палессі. На шляху да яго сустрэнуцца і больш маладыя ягоныя сваякі — ім не больш за дзвесце.

Маршрут працягласцю 12 км пачынаецца ў дуброве разнатраўна-злакавай, дзе сустракаюцца бярозы, асіны, вольхі, сосны, далей ідзе дуброва сніткавая, дзе шмат грабаў, ёсць арэшнік, рабіны, крушыны, грушы, вербы, свідзіна, брукмель.



Сніткавую змяняе чарнічная — з чарнічнікам, семачкам, майнікам, тут больш крушын і рабін, менш грабаў і арэшніку. Сустракаюцца ў дуброве практычна ўсе віды дзятлаў, што ёсць у Беларусі, у тым ліку занесеная ў Чырвоную кнігу жаўна (птушка чорнага колеру з чырвоным «берэтам» на галаве).

У тым жа Азеранскім лясніцтве (13 км ад Турава ў бок Лельчыц) ёсць яшчэ адна экалагічная дарога — да цар-сасны. Вышыня таго дрэва — 24 м, і яму ўжо больш за 320 гадоў. Ідучы гэтым маршрутам, можна раптоўна ўбачыць нават зубра або куніцу ці ваўка, але галоўнае — магутны, сапраўдны лес! Што можа быць найлепей для чалавека, які вырваўся з каменных джунгляў?!



**У размешчанай у Тураве гасцініцы нацпарку (яна называецца «Тураў+») на першым паверсе ёсць выдатная кавярня, галоўны повар якой, Кацярына КІБ, запрашае адведаць гасцей горада любыя стравы беларускай кухні. Сама Кацярына больш за ўсё любіць гатаваць супы (так што ніколі не адмаўляйцеся ад іх за абедам), але пакаштуйце пры гэтым і дранікі, або пюрэ, або бульбу па-вясковаму, або бульбу духмяную. Захочаце свініны — будзе свініна, ласяціны — дык і гэта не праблема.**

**Святлана БАРЫСЕНКА,** *protas@zviazda.by*
**Алена ДАЎЖАНОК. Фота Надзеі БУЖАН.**

УНП 400050258

Усё пра Еву

■ Норавы

# «ПА-ХУТКАМУ» НЕ АТРЫМАЕЦЦА,

## або Развод па-італьянску

**Бадай, няма ў свеце такой краіны, дзе да вузаў Гіменея ставіліся б так сур'ёзна і адказна.**

**Італьянцы славяцца сваім вясёлым і рамантычным норавам, але калі гаворка заходзіць пра шлюб, паводзяць сябе нетыпова: літаральна «адмяраюць» сотню разоў, перш чым зрабіць крок да алтара.**



Зрэшты, гэта цалкам зразумела: у выпадку «непаладак» у сямейных адносінах разводзіцца ім давядзецца гадамі, а то і дзесяцігоддзямі, праходзячы бясконцыя кругі судовых пасяджэнняў. Складаная, забюракратызаваная і дарагая сістэма італьянскага шлюбаразводнага заканадаўства прывяла да двух наступстваў. Першае: у Італіі — самы нізкі працэнт разводаў у Еўропе. Другое: маладыя італьянскія пары ўсё радзей і радзей уступаюць у законны шлюб, аддаючы перавагу банальнаму сужыцельству, абы не звязвацца з дзяржаўнай машынай.

### ЗАБАВА ДЛЯ БАГАТЫХ

Адзін знаёмы італьянец распавёў мне сваю вельмі паказальную гісторыю. Пасля пяці гадоў няўдалага і, што немалаважна, бяздзетнага шлюбу ён сустрэў новае каханне. Здавалася б, з кім не бывае? Нярэдка ў такіх выпадках італьянскія (і не толькі) мужчыны лічаць за найлепшае весці двайное жыццё. Але наш італьянец аказаўся прынцыповым і сумленна прапанаваў жонцы развесціся.

Трэба адзначыць, што гэты адважны ўчынак ацаніла па заслугах толькі яго новая каханая. Астатнія ж, у тым ліку блізкія сваякі і сябры, палічылі нашага героя за вар'ята. Спытаеце чаму? Адказ на гэтае пытанне змяшчаецца ў жарце, які прыдумалі мясцовыя суддзі. Яны гавораць: «Развод — гэта «забава» для багатых...»

Мой знаёмы на той момант быў чалавекам вельмі заможным і поўным энтузіязму пачаць новае жыццё, а таму пайшоў да канца. За што, як кажуць, і паплаціўся... У сувязі з тым, што яго жонка прад'явіла сур'ёзныя маёмасныя прэтэнзіі і згода па іх ніяк не дасягалася, дадзены шлюбаразводны працэс расцягнуўся на доўгія 11 гадоў! Павінна сказаць, што выйшаў з яго наш герой ужо далёка не заможным: судовыя выдаткі, а таксама аліменты на ўтрыманне былой палавінкі склалі каля чатырохсот тысяч еўра!

Дарэчы, за гэтыя няпростыя гады стасункі з новай каханай таксама сябе вычарпалі, і ў выніку разведзены муж застаўся без грошай і ў адзіноце...

### «КАРАНЦІН» АБО МАГЧЫМАСЦЬ ПРЫМІРЭННЯ?

Шматвяковыя традыцыі, культ сям'і і ўплыў Ватыкана сфарміравалі ў Італіі своеасаблівую судовую сістэму, якая гатова «ахоўваць» свяшчэнныя вузы шлюбу да канца, пры гэтым... маючы свае дывідэнды.

Па законе пасля таго, як пара або адзін з сужэнцаў падалі на развод, надыходзіць трохгадовае чаканне, або так званы перыяд «каранціну». На працягу гэтага часу сужэнцы павінны жыць асобна і сустракацца хіба што ў судзе. Вядома нямала выпадкаў, калі не згодныя з разводам жонка або муж заваблівалі пад якой-небудзь зачэпкай свайго былога, напрыклад, «выпіць кавы і сёетое абмеркаваць»... І не важна, ці быў у гэтай кавы які-небудзь працяг. Паказанняў сведак аб факце сустрэчы для суддзяў цалкам дастаткова, каб расцягнуць «каранцін» на новыя тры гады з моманту «кава-паўзы». Але і праз тры гады няма ніякай гарантыі, што развод паспяхова адбудзецца. Пры наяўнасці маёмасных або іншых прэтэнзій судовыя разгляды расцягваюцца на доўгі час...

Што характэрна: італьянскае заканадаўства практычна заўсёды выступае на баку жанчыны. Апрыёры яна — пацярпелая, а таму можа разлічваць на максімальную падтрымку суддзяў. У Італіі разведзеная жанчына застаецца як мінімум пры аліментах. І ў перыяд «каранціну», і пасля разводу італьянскі мужчына абавязаны ўтрымліваць не толькі дзяцей, але і былую жонку.

### ЛЯ ЦАРКВЫ СТАІЦЬ КАРЭТА...

І ўсё ж італьянцы — непапраўныя рамантыкі!

Калі рашэнне ўступіць у шлюб усё ж прымаецца, то больш чым у 70 працэнтах выпадкаў пары лічаць за найлепшае рабіць гэта ў царкве. Безумоўна, царкоўная цырымонія — непараўнальна больш прыгожая і сакральная, чым тая, што здзяйсняецца ў муніцыпалітэце прадстаўніком мясцовай улады. Аднак шлюб, які заключаецца ў царкве, таксама ні ад чаго не застрахаваны, а ў выпадку фіяска яго скасаванне запатрабуе яшчэ большых сіл, часу і сродкаў. У такіх выпадках просьбу аб разводзе неабходна накіроўваць непасрэдна ў Ватыкан. А далей рашэнне будзе залежаць ад спецыяльнай камісіі, якая ў большасці выпадкаў, як паказвае практыка, адказвае адмовай. І гэта таксама ўплыў шматвяковых традыцый. Дарэчы, у Італіі развод быў дазволены ўсяго крыху больш за сорак гадоў таму!

Вядомы сваім рэфарматарскім падыходам Папа Францыск ужо выказаў крытычныя заўвагі наконт забюракратызаванасці шлюбаразводнай сістэмы краіны: маўляў, яна нярэдка пазбаўляе грамадзяніна, які зрабіў памылку, права на далейшае паўнавартаснае жыццё. А таму зрухі ў бок спрашчэння царкоўнага разводу ў будучыні цалкам магчымыя, як яны ўжо сталі магчымыя ў грамадзянскім кодэксе.

### САМАЯ ВЯЛІКАЯ ЎДАЧА

Сёлета ў Італіі абмяркоўваюць адну з самых гучных рэформаў апошніх дзесяцігоддзяў — быў прыняты доўгачаканы законапраект «Аб хуткім разводзе». Што гэта значыць? Перыяд паасобнага пражывання пасля падачы заявы аб разводзе цяпер скарачаецца і будзе доўжыцца ад шасці месяцаў да года. Але такі хуткі развод магчымы толькі пры ўмове ўзаемнай згоды і адсутнасці якіх-небудзь прэтэнзій з таго ці іншага боку. У адваротным выпадку нічога не мяняецца і працэс, як і раней, можа расцягнуцца на гады, з усімі вынікаючымі наступствамі...

А таму, нягледзячы на змены, якія ўжо адбыліся і яшчэ адбудуцца ў сямейным заканадаўстве, італьянцы лічаць правільны выбар партнёра самай вялікай удачай у жыцці.

**Таццяна УЛАДЗІМІРАВА,**
*Мілан*

■

■ Нататнік Яго жонкі



**Святлана ДЗЯНІСАВА, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць»**

# ПРА ГОНАР І ПРАС

У старым інтэрнаце, які даўжэзныя восем гадоў як мог выконваў ролю нашага першага дома, у адным з канцоў асветленага акном вузкага калідора стаяў пры сцяне пад электрычнай разеткай стары драўляны стол, абабіты пацёртай коўдрай. Прызначэнне яго было відавочным: і ўранку, і ўдзень, і ўвечары пры ім завіхаліся з прасам. Маці немаўлят чулі пры гэтым ад шпацыруючых у бок кухні больш сталых гаспадынь з дня ў дзень адно і тое: «Вось Каця (Таня, Лена, Воля, Даша) прасуе свой кіламетр пялюшак». Такая тут хадзіла прымаўка.

Падрасталі адны немаўляты — нараджаліся новыя. Высяляліся шчаслівыя гаспадынькі ў свае кватэры — і ў вызваленыя пакоі засяляліся... таксама шчаслівыя, многія з якіх чакалі ўжо сваіх немаўлят. А стары драўляны стол, абабіты пацёртай коўдрай, працягваў стаяць у канцы калідора пры сцяне пад электрычнай разеткай, заўсёды гатовы ўзваліць на сваю ў літаральным сэнсе спіну новы кіламетр пялюшак.

Я так часта ўспамінаю наш інтэрнат... Ледзь не кожную раніцу. Вось як прас у разетку ўторкваю, дык і ўспамінаю. Мае кіламетры пялюшак даўно памяняліся на кіламетры рукавоў, спінак, полачак і калашын, выратаваць ад якіх мяне змогуць хіба што нявесткі, кожную з якіх я ўжо даўно, яшчэ завочна, палюбіла.

Я ведаю, што ёсць жанчыны, якія прасуюць нават наскі і шнуркі, і гэта ніякія не гераіні анекдотаў, а цалкам рэальныя істоты (яны маюць «пункцік перфекцыяністкі» ў галаве). У мяне такога пункціка няма. Я прасую адмераныя мне кіламетры — і мару пра тыя часы, калі сляды высакароднай пакамечанасці зробяцца ў грамадстве нормай. Або калі адменяць офісны стыль. Або калі вынайдуць новыя віды тканіны. Або... Сярод самых розных варыянтаў пераўвасаблення свету я разглядаю нават і такі, пры якім пакамечанасць зробіцца стылем, трэндам, ладам жыцця — як выклік агульнапрынятаму і надакучліваму пафасу і абмежаванням, неабходнасці «быць як усе». Як ні круці, а думкі, якія прыходзяць у галаву падчас прасавання, можна назваць адным словам: рэвалюцыйныя.

Зразумела, можна адмовіцца ад гэтай больш чым няўдзячнай справы, «забіць» на «традыцыі», абвясціць раўнапраўе і перадаць адказнасць і паўнамоцтвы непасрэдна гаспадарам рукавоў, спінак, полачак і калашын. Але...

Тут уся справа ў жаночым гонары. Дакладней у тым, як хто яго бачыць.

Некага жаночы гонар прымушае крыўдаваць з нагоды і без, паказальна станавіцца ў «позу». Мы, маўляў, моцныя: і смецце можам вынесці, і мозг — таксама без праблем. Некаторых той самы жаночы гонар прымушае кідаць тэлефонную трубку, шпурляць у твар кветкі або збіраць чамаданы, бо інакш нічога, маўляў, не дакажаш. Некаму ён не дае ніякай магчымасці памірыцца ў дзень сваркі і настойліва даводзіць, што трэба не менш як тыдзень пераканаўча і прынцыпова маўчаць «быццам рыба аб лёд»...

Рэдкая, скажу я вам, жанчына ведае, што на самай справе жаночы гонар — гэта простае прыняцце таго факта, што мужчына ёсць істота, далёкая ад ідэалу. Два ідэалы пад адным дахам — з'ява рэдкая, нават анамальная. Толькі ў аднаго з сям'і атрымліваецца так цудоўна, так ідэальна прасаваць рукавы і каўнерыкі...

Што б вы тут ні прачыталі, а напісана толькі тое, што хацелася напісаць: лепш развітацца з гонарам дзеля чалавека, якога кахаеш, чым развітацца з чалавекам, якога кахаеш, дзеля гонару.

■ Асабістае

# АХ, КАХАННЕ...

«СВАТЫ! Сваты да Насці едуць! — беглі з вясёлым гіканнем па вуліцы хлопчыкі, — сваты!..»

У вёсцы кожная дробязь — падзея. А ўжо сватанне — амаль «сусветная рэвалюцыя»...

Гэтая вестка ўзрушыла вёску. Настрой узняўся — як быццам сваты ехалі не да Насці, а асабіста ў дом да кожнага...

Бабы гліняныя чыгуны пакідалі:

— Да Насці сваты?.. Калі?..

— Ды ў суботу!!!

Увечары ўся вёска на лаўкі, як гарох, высыпала — ад старога да малога. Думаюць-разважаюць... Паўспаміналі ўвесь радавод Насці, яе бацькоў-нябожчыкаў...

Насця — дзяўчына добрая, станоўчая. Характарам спакойная — у бацьку. Працаваць умела. Бацькі яе неяк рана памерлі. Засталася жыць у іх доме. Але неўзабаве да яе старэйшая сястра Фядора з дзецьмі перабралася. У той свая хата была. Ды рамонт у ёй патрабаваўся. Вось яна нахрапам у Насціну і ўлезла. А дзяцей у гэтай сястры — малы малога меншы... Дык Насця там і за няньку, і за хатнюю прыслужніцу. Сама Фядора сваіх дзяцей не вельмі глядзела — «на гулі» яе цягнула, неўтаймоўную. Мужыкі ў яе ўсё больш «транзітныя» былі. І заставалася яна пасля чарговай «любові» адна і з чарговым малалетнім дзіцем на руках... А ціхая Насця моўчкі і цярпліва вяла гаспадарку, глядзела дзяцей, ды гаспадыняй ва ўласным доме не лічылася.

Затое мелася ў Насці свая аддуха — песні... Голас у яе быў незвычайнай прыгажосці. Моцны, зычны. На адным канцы вёскі заспявае, а на другім кветкі зацвітаюць... На ўсіх дзявочых вячорках яна запявалай была. Вось тут і смеласць аднекуль бралася, і прыгажосць яе раскрывалася. І свяцілася Насця знутры, быццам лямпачку ў ёй запальвалі.

ВОСЬ да гэтай Насці і пасватаўся Мішка з суседняй вёскі. Пахадзіў да яе, пахадзіў. На лаўцы, як належыць, пасядзелі. Зоркі на небе палічылі, і сказаў ёй: «Збірай, Насця, радню — у суботу сваты прыедуць!»

Насця ад шчасця на сёмае неба ўзляцела! Пяшчоты яна няшмат бачыла ў жыцці. А тут перад ёй цэлая карціна будучага жыцця адкрылася! І Мішка — хлопец самавіты. І дом, нарэшце, свой можна пабудаваць, і дзетак нараджаць.

Назаўтра Фядора гэтую навіну радні аж у суседніх вёсках паведаміла. Не глядзі, што шалапутная, а за сястру, відаць, ад усяго сэрца ўзрадавалася — хай і на яе вуліцы свята будзе!

Да сватоў рыхтаваліся як след. Сяброўкі Насціны некалькі дзён кухарылі-стараліся. Дзятва на плоце, босымі нагамі буксуючы, цэлымі днямі цяпер дзяжурыла — ім печаных ласункаў увесь час «падсыпалі». Радаваліся і старэйшыя хлопцы. Ведалі, па няпісаным законе і ім «чакушка» дастанецца!..

У суботу пасля абеду радня з суседніх вёсак падцягвацца пачала. Вуліца неяк прыбралася і павесялела. Выслалі «дазор» з тых, хто маладзейшы, на ўскраіну, каб паведамілі: калі?..

Народ сядзеў на лаўках і на прызбах. Дзень быў прыгожы. Здавалася, нават птушкі, кінуўшы чысціць пёры на правадах, з цікаўнасцю разглядалі прысутных.

Да вечара ў двары ўжо заспявалі... Пахаладала. Вярнулася з «дазору» малышня. З варот раз-пораз выходзілі запрошаныя, нецярпліва пазіраючы ў канец вуліцы. І чым глыбей садзіўся вечар на хаты, тым мацней наспявала адчуванне трывогі.

Фядора, усхваляваная больш за іншых, агародамі пабегла да швагры жаніха. Удваіх яны праз поле кінуліся ў суседнюю вёску.

Мішка ляжаў на канапе. Гультаяватыя мухі круціліся вакол цьмянай лямпы. Побач важдалася маці. Укладваўся спаць бацька. Дзверы расчыніліся, на парозе ўзніклі швагер і задыханая Фядора.

— Дык, Мішка, што гэта? Што здарылася?! — з трывогай выдыхнула яна.

Мішка перагледзеўся з бацькам і пытанне Фядоры адзінока павісла ў напружаным паветры.

— Не пайду я, — нарэшце выцадзіў ён.

— Як гэта не пайду? — збянтэжылася Фядора. — Там жа людзі чакаюць! Сталы прыгатавалі, радня з суседніх вёсак прыехала!.. Ты што?!..

— Ды не пайду я і ўсё, — рэзка адсёк Мішка.

І тут... дзясятым жаночым нюхам сваім яна раптам здагадалася, што справа не ў Насці, а ў ёй, Фядоры. І што гэта з-за яе «біяграфіі» цяпер пад корань сякуць Насцін лёс. І Фядора, грубая і ўладная, амаль запрасілася:

— Ды ты чаго, Міша, ты не думай, я ж вам перашкаджаць не буду. Вы самі сабе... Хочаш — да сябе яе бяры, хочаш — дом рамантуйце.

Не вытрымаўшы яе погляду, Мішка адвярнуўся да сцяны. І ўжо разумеючы, што размова не мае сэнсу, яна яшчэ лепятала пра тое, што ён абяцаў... І пра гатовыя сталы, і пра людзей, якія «там чакаюць»...

У ВЁСКУ вярнуліся за поўнач. Большая частка людзей разышлася. Астатнія стойка трымаліся, вырашыўшы даведацца праўду.

— Не прыйдзе ён, — упалым голасам паведаміла Фядора, — сказаў, што перадумаў...

У хаце павісла такая цішыня, што чуваць было рыпенне адчыненых дзвярэй... Ціха ўсхліпнула Насця, ускочыла і выбегла на вуліцу. Яна бегла праз агароды не чуючы ног, да канавы, у чарот, дзе ніхто не ўбачыць яе знявагі і болю. Толькі мама і тата, якія глядзяць зверху і нічым не могуць дапамагчы...

...Цэлае лета яна не выходзіла з двара. Праз год яе сасватаў удавец з траімі дзецьмі. Неяк позна восеньскім вечарам, калі ўжо ішлі зацяжныя верасвнёўскія дажджы, Насця неўпрыкмет села да ўдаўца ў воз і паехала, знікнуўшы з нашай вёскі назаўжды...

А Мішка праз паўгода жаніўся. Але потым жонка яго за штосьці выгнала... Ніхто не ведаў, за што. Доўга ён халасцякаваў, дзеўкі ад яго чамусьці шарахаліся. А затым пайшоў у «прымакі» да адной дзяўчыны ў гадах. Жыў з ёй, потым яго паралізавала.

А Насцін удавец неяк рана памёр. Насця нарадзіла яму яшчэ дваіх дзяцей — да яго ранейшых траіх. І засталася потым адна з усёй гэтай плоймай.

І ўжо ва ўзросце, пасля ўсіх бед, на яе звалілася позняе нечаканае каханне... Пакахала Насця шафёра, жанатага. І, разумеючы ўсю немагчымасць гэтага кахання, яна часам выходзіла за вароты, садзілася на лаўку і спявала сваім выразным і прыгожым голасам. І ляцела яе песня над вёскай, бударажачы сэрцы маладых, што сядзелі на лавачках. І ніхто ўжо не смяяўся з яе, а ўсе маўчалі і слухалі:

*« Ах, каханне ты, каханне, —*
*Куды ж ты падзелася?!*
*Мусіць, ты, маё каханне,*
*Над лесам разляцелася...»*

**Ларыса КАРАСІНА**

■

■ Паміж намі



# ЛАВІСЯ, РЫБКА, ВЯЛІКАЯ І... ЯШЧЭ БОЛЬШАЯ,

## або Як падчапіць мужчыну «на кручок»

**Дарэмна чакаць, што рыба самастойна заскочыць у вашу каструлю для юшкі. Гэтак жа марна спадзявацца, што мужчына, які вам падабаецца, сам прыйдзе і прапануе блізкія адносіны. Чым адрозніваецца лоўля рыбы ад лоўлі мужчыны? Правільны адказ: нічым.**

Непрадузятая статыстыка сцвярджае, што прадстаўніц прыгожага полу ў нашай краіне па-ранейшаму больш, чым мужчын. Калі ж улічваць тое, што «нармальных пацаноў», з якімі можна пабудаваць трывалыя адносіны, увогуле няшмат, «конкурс» на месца побач з такімі выбітнымі асобінамі істотна ўзрастае. Таму жанчынам даводзіцца выкарыстоўваць усялякія хітрыкі, каб звярнуць на сябе ўвагу.

Аднак перш чым распачынаць актыўныя дзеянні, разведайце некаторую інфармацыю пра мужчыну мары. Калі вы сустрэліся, напрыклад, у агульных знаёмых або разам працуеце ў адным офісе, можаце незнарок пацікавіцца ў астатніх наконт яго інтарэсаў і захапленняў, удакладніць сямейнае становішча. (Вы ж не хочаце стаць пасіяй састарэлага інфантыла, у якога дома 5 катоў і столькі ж дзяцей ад розных шлюбаў!) Халасты? Не прыцягваўся? Не ўдзельнічаў? Трэба браць! А значыць, дзейнічаць!

Па-першае — і тут мы не скажам нічога новага — звярніце ўвагу на сваю знешнасць. Якім бы багатым ні быў ваш духоўны свет, разгледзець яго з першага погляду нерэальна. Каб прымусіць мужчыну кінуць вам услед зачараваны позірк (і не адзін!), выглядаць трэба на ўсе сто. Але будзьце ўважлівыя, не рабіце памылку многіх жанчын: «баявая размалёўка», аголенасць усяго і адразу, вульгарная біжутэрыя, крыклівыя колеры адзення толькі адпужваюць мужчын. На ўсім гэтым пастаўце вялікі крыж (вядома, калі вы не Лэдзі Гага ці хаця б Жанна Агузарава). Мужчынам падабаюцца жаноцкасць, акуратнасць і дагледжанасць. І памятайце: лепш апрануцца ў нешта зручнае, чым у звышмоднае. Упэўненая ў сабе дзяўчына ў балетках, якая ідзе з горда паднятай галавой, выйграе ў сваёй згорбленай канкурэнткі на абцасах, якая толькі і думае пра тое, каб не ўпасці.

«Раскажыце» мужчыну пра сваю сімпатыю з дапамогай зацікаўленага і крыху гуллівага позірку. А вось доўгі пранізлівы позірк пакіньце Кашпіроўскаму. Калі вам давядзецца кантактаваць, не жуйце ў гэты момант жвачку, не скрыжоўвайце рукі на грудзях, не глядзіце па баках ці на гадзіннік. Усім сваім выглядам паказвайце, што вам камфортна тут, побач з ім.

Усміхайцеся! І не толькі «таму самаму» мужчыну, а ўсім. Будзьце дружалюбнай і добразычлівай — маркотная насупленасць, прыгнечанасць жыццём (лёсам, балансавай справаздачай) не выклікаюць прыязнасці. Навучыліся ўсміхацца — навучыцеся і смяяцца! У тым сэнсе, што, на жаль, не ўсе дамы (ды што там дамы...) валодаюць карыснай якасцю смяяцца прывабна. Патрэніруйцеся смяяцца меладычна і пры тым ненапружана, навучыцеся кантраляваць сябе і свае непрыемныя «звычкі ў смеху» (павізгванне, рохканне, іржанне і да т.п.). Што дазволена парсючку, не дазволена такой цікавай даме, як вы.

Усе гэтыя «вонкавыя» хітрыкі, вядома, эфектыўныя, але не менш важную ролю адыгрываюць вашы паводзіны, тое, што і як вы гаворыце. Мужчыну вельмі важна, каб жанчына ўважліва слухала яго і пагаджалася з ім (напэўна, вам будзе лягчэй выканаць гэты «наказ», калі аб'ект сімпатыі — ваш начальнік. Жартуем, вядома). Прынцыпы і перакананні — гэта тое, чым прадстаўнікі моцнага полу звычайна ганарацца. Калі вы разышліся ў меркаваннях, пазбягайце катэгарычных фраз накшталт «ты не маеш рацыю», «я лепш ведаю, як правільна». Не раньце яго самаацэнку.

Памятайце, што мужчына любіць прыемныя словы ў свой адрас. Калі ён выдатна расказвае анекдоты або смажыць шашлыкі, скажыце яму пра гэта. Пакажыце, што вы заўважаеце і шануеце яго ўменні. Ацаніце яго фізічныя вартасці (пры іх наяўнасці, зразумела). Нават калі ў вашага мужчыны з дзясятак лішніх кілаграмаў, напэўна, у яго абаяльная ўсмешка. Ці брутальная лысіна... Хаця не, з апошнім лепш не рызыкуйце... Што рабіць, калі вашага любага хваліць асабліва няма за што? Як казаў герой аднаго серыяла, «калі ваш мужчына нічога не робіць, кажыце яму, што ён РАСКОШНА нічога не робіць».

Мужчыны лічаць прыцягальнымі тых жанчын, якія шчыра цікавяцца іх жыццём і справамі. Паспрабуйце падзяліць з ім яго захапленні, тады ў вас будзе больш тэм для размоў, а значыць, больш шанцаў яго заваяваць. Ён любіць бегаць? Чаму б і вам не стаць прыхільніцай здаровага ладу жыцця! Наведвае лекцыі пра сучаснае мастацтва? Для вас таксама будзе карыснай самаадукацыя! Час ад часу дзеля вострых адчуванняў ён крадзе ёгурты ў прадуктовай краме? Пачакайце-пачакайце... Не варта станавіцца на крымінальную дарожку. Заставайцеся сабой, не ўпадайце ў крайнасці і не страчвайце сябе, нават калі чалавек вам вельмі падабаецца. Акрамя таго, калі мужчына сустрэне вас і на стадыёне, і ў лекцыйным зале, і ў краме, такая дакучлівасць яго дакладна напалохае. Не ганяйцеся за мужчынам, пакіньце і яму магчымасць заваёўваць вас.

Дэманструйце сваю слабасць. Усёмагутныя супержанчыны падабаюцца прадстаўнікам моцнай паловы чалавецтва толькі ў тым выпадку, калі яны — гераіні коміксаў. У мужчынах закладзена натуральнае жаданне абараніць жанчыну. Не бойцеся звярнуцца да аб'екта сімпатыі і папрасіць яго дапамагчы — напрыклад, абнавіць праграму на смартфоне або пракансультавацца наконт выбару новага камп'ютара. «Аб'ект» з разумным выглядам пачне даваць тлумачэнні (нават калі сам як след не разбіраецца) і, вядома, перапоўніцца ўсведамленнем уласнай выключнасці. Яшчэ б — ён такі разумны, такі дасведчаны! А жанчына побач — такая ўважлівая! І вочы ў яе прыгожыя... І наогул яна вельмі нават нічога... Вось-вось, менавіта так усё і адбываецца. Пасля таго, як ваш «выбраннік» выканаў просьбу, не забудзьцеся падзякаваць яму і зрабіць камплімент у яго адрас (ну, гэта мы з вамі ўжо праходзілі).

І яшчэ некалькі важных «дробязяў».

Будзьце загадкавай. Калі мужчына ведае пра жанчыну ўсё, цікавасць да яе паступова знікае. Будзьце самадастатковай. Развівайцеся, вучыцеся новаму, смакуйце жыццё ва ўсіх яго праявах, радуйцеся кожнаму дню... Глядзіш — і мужчыны падцягнуцца. У рэшце рэшт, прываблiванне мужчын — гэта ж не мэта вашага існавання! Так, прыемныя моманты... Будзьце мудрай. Мудрая жанчына разумее, што ўсе мужчыны розныя і да кожнага трэба знайсці падыход, які можа выходзіць за рамкі або ўвогуле супярэчыць усім апісаным рэкамендацыям. І апошняе — будзьце шчырай. Не іграйце чужую ролю. Не можаце карыстацца жаночымі хітрыкамі — не трэба, хай ён палюбіць вас такой, якая вы ёсць. Лавіце на чарвячка, а не на блешню. Удачнай вам рыбалкі!..

**Міра КРАВЕЦ.**

■

■ Машына часу

# Дыназаўры з Чыжоўкі

## Карэспандэнты «Звязды» пераканаліся: яны дзікія, але сімпатычныя

**З глыбіняў заапарка даносіцца грозны рык. Гэта не леў і не тыгр, а зусім нязвыклы для мінчан «звер» — падобны да бегемота дыназаўр медузацэратопс. Ён не толькі пагрозліва рыкае, але і варушыць хвастом і лапамі, круціць галавой, міргае і цяжка дыхае — вось-вось скокне (хоць на шыльдзе напісана: харчуецца пераважна нізкарослай расліннасцю) на сваю ахвяру. А крыху наводдаль з кустоўя даносіцца гук, падобны на птушыны свіст. Гэта аравітаўр, ён выглядае не такім страшным, як медузацэратопс, але толькі здаецца бяскрыўдным. Гэты маленькі дыназаўр усёедны, ён мае бяззубую дзюбу і магутныя сківіцы, якія могуць літаральна раздрабіць істоту, што сустрэнецца яму на шляху.**

### ДРЫЖЫКІ Ў ДАРОСЛЫХ І ЗАХАПЛЕННЕ Ў ДЗЯЦЕЙ

Дагістарычныя драпежнікі, траваедныя і лятучыя яшчары пасяліліся ў сталічным мікрараёне Чыжоўка на тэрыторыі мінскага заапарку. Адкрыццё першага ў Беларусі Парка дыназаўраў, што адбылося на мінулым тыдні, упершыню дало магчымасць жыхарам нашай краіны перанесціся з рэальнасці ў эпоху старажытных рэптылій і сутыкнуцца з тымі, хто насяляў планету 100 мільёнаў гадоў таму.

У дзень адкрыцця «ДынаПарка» ля кас выстраіліся чэргі, і нават не самы танны кошт квіткоў — 110 тысяч рублёў на чалавека — не спыніў ахвотных дакрануцца да экзатычных істот.

Новая экспазіцыя ўяўляе сабой 35 дыназаўраў у поўным памеры, якія размясціліся на 4 гектарах зямлі. 25 з іх вельмі рэалістычныя — варушацца, рыкаюць, дыхаюць, міргаюць і блішчаць каляровай скурай. Яшчэ 10 — статычныя, і менавіта яны прынялі на сябе першы «ўдар» ад самых маленькіх наведвальнікаў, якія адразу радасна «акупавалі» рэптылій, улезшы ім на карак, павіснуўшы на шыях і фатаграфуючыся. Зрэшты, для людзей усе фігуры абсалютна бяспечныя, паколькі выкананы з экалагічна чыстых матэрыялаў. А вось пра бяспеку саміх дыназаўраў арганізатарам варта было б паклапаціцца больш...

Першай беларускай "зоркай", якая пабывала ў "ДынаПарку", стаў спявак Дзядзя Ваня. Ён даследаваў экспазіцыю разам з маленькай дачкой Міраславай.

— Былі моманты, калі з кустоў чуўся незразумелы рык і дрыжыкі беглі па скуры. На што дзіця тут жа рэагавала: «Тата, пайшлі туды!», — падзяліўся ўражаннямі спявак.



### «Я НЕ СПЛЮ НАЧАМІ — ДУМАЮ, ЯКІМІ «РАЗЫНКАМІ» АБСЫПАЦЬ «ДЫНАПАРК»

Па словах 25-гадовага **дырэктара «ДынаПарка» Вадзіма ШЛАПАКОВА**, каманда спецыялістаў — а гэта на розных этапах каля сотні чалавек — працавала над паркам і ўдзень, і ўначы. «У гэтым сезоне ўсе фігуры мы запускаем у тэставым рэжыме. Яны ствараліся з улікам асаблівасцяў нашага клімату, таму пакуль хочам паглядзець, як вытрымае тое ці іншае пакрыццё ўмовы надвор'я».

Новыя «насельнікі» мінскага заапарка былі выраблены ў Кітаі — цана экспанатаў у гэтай краіне значна ніжэйшая, чым у іншых вытворцаў. Дырэктар парка дыназаўраў адзначае: думка, што ў Кітаі робяць кепска, — памылковая. У Кітаі робяць па-рознаму, перакананы ён. Інвеставалі ж грошы ў праект уладальнікі дынапарка ў Клайпедзе, дзе падобны атракцыён адкрыўся тры гады таму. Суседзі падзяліліся сваім вопытам і дапамаглі пазбегнуць у беларускім парку рэптылій многіх памылак, з якімі давялося сутыкнуцца ім самім.



Фота Надзеі БУЖАН.

Пакуль яшчэ не ўсе работы завершаны. Арганізатары старалiся максімальна паспець да дня адкрыцця, падрыхтоўка да якога заняла чатыры месяцы: два з іх фігуры выраблялі, і столькі ж яны плылі ў Беларусь.

— Хто быў у дынапарках за мяжой, той убачыць асаблівасці нашага парка. Я не сплю начамі і думаю аб тым, якімі яшчэ «разынкамі» абсыпаць мінскі парк дыназаўраў на тры-чатыры гады наперад. Таму ў наступным годзе эфект «ваў!» таксама будзе, — прызнаўся Вадзім Шлапакоў.

Сярод ідэй — стварыць фігуры, на якіх дзеці змогуць катацца, а таксама такіх, што самі будуць хадзіць па тэрыторыі парка. Вадзім Шлапакоў марыць арганізаваць у «ДынаПарку» шоу — бітву двух дыназаўраў, якая будзе праходзіць некалькі разоў на дзень. Апроч таго, тут будзе рэстаран і разнастайныя гурткі для дзяцей.

«ДынаПарк» будзе працаваць круглы год (матэрыялы, з якога выкананы экспанаты — марозаўстойлівыя), таму сфатаграфавацца з рэптыліяй у снезе таксама будзе магчыма. Зімой, дарэчы, білеты патаннеюць, бо фігуры не будуць рухацца. А для дзяцей да 5 гадоў уваход бясплатны ў любы час года.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
*seradzyuk@zviazda.by*

Даты | Падзеі | Людзі

**8 ЖНІЎНЯ**

**1899** год — вынаходнік з Мінесоты Альберт Маршал запатэнтаваў халадзільнік. Халадзільныя канструкцыі прыдумлялі і раней. У асноўным яны дзейнічалі за кошт купленага лёду. Першыя хатнія халадзільнікі спажывалі шмат дроў, вугалю і газы. У 1911 годзе фірма «Джэнерал электрык» наладзіла выпуск халадзільнікаў больш-менш сучаснага тыпу: халадзільная машына змяшчалася ў кухоннай шафе. Аднак яна занадта шумела і з-за таго, што працавала на газе, дрэнна пахла. Гэта было яе галоўнай заганай. У 1926 годзе дацкі інжынер Стындруп распрацаваў бясшумны халадзільнік. Пасля гэтага апарат хутка стаў у Амерыцы папулярным бытавым прыборам. Праўда, першыя халадзільнікі каштавалі ў два разы даражэй, чым аўтамабілі маркі «Форд». Іх называлі «хатняй фабрыкай холаду». У СССР першыя халадзільнікі былі створаны ў 1937 годзе на Харкаўскім трактарным заводзе, а масавая іх вытворчасць была засвоена толькі ў 1960-я гады. Да гэтага гаспадыні СССР абыходзіліся ў асноўным кухоннымі лядоўнямі. Гэта былі простыя шафы з аддзяленнямі для лёду, цеплаізаляцыяй, паддонам і трубкай для зліву талай вады.

**1900** год — у Брукліне (ЗША) пачаўся першы матч за кубак Міжнароднай федэрацыі лаўн-тэніса. У якасці ўзнагароды пераможца атрымаў сярэбраны кубак, які быў ахвяраваны арганізатарам першага матча студэнтам Гарвардскага ўніверсітэта Дуайтам Дэвісам. Спаборніцтвы сталі называцца камандным першынством за Кубак Дэвіса ці проста Кубкам Дэвіса, — сёння гэта найбуйнейшыя міжнародныя камандныя спаборніцтвы ў мужчынскім тэнісе. Кубак Дэвіса лічыцца самым прэстыжным тэнісным трафеем ў мужчынскім тэнісе. Сам галоўны прыз уяўляе сабой сярэбраную чашу з пазалотай вышынёй у 33 сантыметры і дыяметрам 45 сантыметраў. У першыя гады за кубак змагаліся толькі каманды дзвюх краін — ЗША і Вялікабрытаніі. Цяпер у Кубку Дэвіса прымаюць удзел больш за 140 камандаў з усіх кантынентаў.



**1945** год — 70 гадоў таму Савецкі Саюз аб'явіў вайну імперыялістычнай Японіі — пачатак ваенных дзеянняў Чырвонай Арміі на Далёкім Усходзе.

Было сказана

**Віктар ШНІП, паэт:**
*Як дуб за жвір трымаецца карэннем,*
*Так Беларусь стаіць на курганах.*

**Прыміце віншаванні!**
Мая бабуля вельмі любіць газету «Звязда»,
і нам хочацца, каб менавіта тут яна прачытала,
што яе муж Васіль, дочкі Ганна і Наталля, а таксама шасцёра ўнукаў віншуюць яе з 60-годдзем!
Зычым ёй, нашай любімай, моцнага здароўя, шчасця і ўсіх зямных даброт!
**Аляксандра Акуліцкая,** *г. Полацк.*
**Ад рэдакцыі:** *Дзяўчынка не паведаміла, на жаль, у які дзень бабуля святкуе дзень нараджэння і як яе завуць. Але ж спадзяёмся, што наша падпісчыца сябе пазнае.*

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

## ПАКАШТУЙЦЕ!

### Катлеткі ў сетцы



***Спатрэбіцца:*** *мясны фарш — 500 г, цеста слаёнае бяздрожжавае — 250 г, грыбы — 150 г, яйка курынае — 1 шт., цыбуля рэпчатая (сярэдняя) — 2 шт., мука — 3 ст. л., соль, спецыі (для фаршу) — на смак, алей.*

Цыбулю нарэзаць дробнымі кубікамі. У фарш дадаць палову цыбулі, яйка, соль, спецыі і добра змяшаць. Другую палову цыбулі абсмажыць у невялікай колькасці алеі. Дабавіць да смажанай цыбулі дробна парэзаныя грыбы і смажыць да выпарэння ўсёй вадкасці. Астудзіць. З фаршу зрабіць катлеты і абкачаць у муцэ. Абсмажыць катлеткі ў невялікай колькасці алею да залацістага колеру. Выкласці абсмажаныя катлеты на засланую пекарскай паперай бляху, зверху пакласці абсмажаныя з цыбуляй грыбы. Слаёнае цеста крыху раскачаць і парэзаць на квадраты памерам прыкладна 10х10 см. На кожным квадраце нажом зрабіць надрэзы ў хаатычным парадку. Загарнуць нашы катлеты цестам, крыху яго расцягваючы, і зашчыпаць канцы знізу катлеткі. Выпякаць пры 200 градусах 30-35 хвілін.

## РАПТАМ СПАТРЭБІЦЦА

### Прыкметы спелага кавуна



1. Буйны, але не цяжкі.
2. Трашчыць, калі яго сціснуць.
3. Пры паляпванні чутны глухі гук.
4. Няма надрэзаў і расколін.
5. Сухая пладаножка.
6. На баку кавуна лёгка заўважыць жоўтую пляму сярэдніх памераў — месца, якім ён ляжаў на зямлі.
7. Верхні слой бліскучы, без матавага налёту.
8. Палоскі выразныя і яркія.
9. Калі правесці пазногцем па лупіне, абавязкова застаецца след.
10. У натуральнага кавуна паверхня зрэзу зярністая, у «хімічнага» — гладкая і глянцавая. Жаўтлявыя пражылкі ў мякаці кавуна сведчаць аб наяўнасці ў ім нітратаў.

## ВАРТА ВЕДАЦЬ

• Калі ачышчаны часнок заліць алеем, ён будзе захоўвацца ў халадзільніку працяглы час. А яшчэ вы атрымаеце выдатную запраўку для салаты — часночны алей!

• Запомніце: алей не павінен стаяць у халадзільніку, але і ў гарачыні яму не месца. У такіх выпадках ён губляе вітаміны і карысныя элементы. Найлепшая тэмпература захоўвання — ад 5 да 20 °C.

## ГАСПАДАР У ДОМЕ

### Рамонт сваімі рукамі



➤ Каб лёгка ўбіць цвік, трэба акунуць яго вострый канец у алей.

➤ Дабаўце ў раствор цэменту цукар, і ён стане нашмат мацнейшым.

➤ Калі трэба замазваць шчыліны — развядзіце алебастр малаком. Так ён будзе даўжэй застываць.

➤ Каб кафляную плітку не паламаць падчас разразання, добра яе намачыце. Верагоднасць таго, што яна зламаецца, паменшыцца ўдвая.

➤ Нельга адчыняць вокны ў памяшканні, якое толькі што абклеілі шпалерамі. Ад гэтага яны пачнуць тапырыцца і адклейвацца.

➤ Каб візуальна павялічыць аб'ём памяшкання. выкарыстоўвайце шпалеры і фарбы светлых тонаў. Цёмныя тоны візуальна змяншаюць аб'ём пакоя.

➤ Пры выбары шпалер улічвайце, на які бок выходзіць памяшканне. Калі бок сонечны, не варта яго абклейваць шпалерамі, якія мыюцца. Яны вылучаюць шкодныя для здароўя рэчывы пад дзеяннем прамых сонечных прамянёў.



➤ Пэндзаль для алейных работ вельмі каляны? Апусціце яго на 1 хвіліну ў кіпячы воцат.

➤ Адвалілася кафля? Каб трывала яе замацаваць, выкарыстоўвайце цынкавыя бялілы, густа зацёртыя натуральным пакостам. Праўда, гэты спосаб хоць і недарагі, але сумесь доўга сохне.

## ПАРАДЫ БЫВАЛЫХ

✓ Шкляны посуд можна адмыць вельмі проста і без бытавой хіміі з крамы. Для гэтага ў цёплую ваду трэба дабавіць трохі воцату і солі. Посуд стане больш чысты і празрысты.

✓ Алюмініевыя каструлі стануць зноў бліскучымі ўсярэдзіне, калі пракіпяціць у іх ваду з бульбянымі ці яблычнымі лупінамі, рэвенем або растворам воцату.

✓ Эмаліраваныя каструлі, якія пацямнелі з часам або прыгарэлі, трэба пракіпяціць з любым сродкам для мыцця посуду з дабаўленнем 1 ст. л. соды. Затым добра прамыйце іх гарачай вадой. Для прадухілення пацямнення кіпяціце іх з растворам воцату раз на месяц.

✓ Халадзільнік унутры вельмі добра чысціцца растворам соды. Вазьміце 4 ст. л. соды на 1 л вады. Нанясіце і пратрыце. Свежасць і чысціня гарантаваныя!

✓ Нядоўга паварыце гаспадарчае мыла ў падгарэлай каструлі. Затым яе можна будзе лёгка адмыць губкай.

✓ Каб у муцэ не заводзіліся жучкі, пакладзіце ў месца, дзе яна захоўваецца, пару зубчыкаў часнаку, не чысцячы яго ад шалупіны.

✓ Каб нажы было лягчэй завастрыць, змясціце іх у слабы салёны раствор на некаторы час і тачыце не выціраючы.

■ Песню бярыце з сабою

# ВАСІЛЁЧКІ-ВАСІЛЬКІ

**Вясёлая, па-юнацку гарэзлівая песня «Васілёчкі-васількі», створаная Сяргеем Харэвічам у садружнасці з маладым аматарам паэзіі Дзмітрыем Ермаловічам-Дашчынскім, з інтрыгаю перадае мройны стан закаханага, яго неўтаймоўную цягу да ўзаемінаў.**

Васількі ў песні выступаюць абярэгам кахання. Асвечаныя нябеснай красою, яны лічацца сімвалам даверу, вернасці, чысціні памкненняў. Ярка-сінія кветкавыя кошыкі на разгалінаваным касмата-павуціністым сцябле з шэра-зялёнымі лісточкамі ствараюць таямніча-прывабны вобраз загадкавай расліны, якую ў нас называюць і васільком, і валошкаю. Гэтыя прыгожыя кветкі, як і каханне, вольна красуюцца ў прыродных умовах, з мая да кастрычніка ўпрыгожваюць нашы хлебныя нівы, сустракаюцца ў прысадах і на пясчаных схілах. Але ў букетах яны, пазбаўленыя роднай прасторы, страчваюць нябесны колер, хутка пачынаюць ружавець, бялець. Таму ў душы юнака ўзнікаюць неспакой, трывога, што разгорнута пададзена ў прыпеве.

Песня «Васілёчкі-васількі» запісана на дыску «Далёкае і блізкае маё...» (2014) Сяргея Харэвіча, якому адлюстраваць душэўныя пошукі і перажыванні закаханага дапамагае Жанна Піваварава.




**Верш Сяргея Харэвіча і Дзмітрыя Ермаловіча-Дашчынскага**
**Музыка Сяргея Харэвіча**

Пагадаю на рамонках,
Адпачну у васільках
І да нашага спаткання
Паблукаю ў летніх снах.

Прыпеў:

Васілёчкі, васілёчкі,
Заплятайцеся ў вяночкі.
Васілёчкі-васількі...
Будзем разам я і ты.

Я дарыў табе валошкі.
А ты знікла ў дзіўных снах —
І скрабуць на сэрцы кошкі,
Палыном наш луг прапах.
Прыпеў:
Васілёчкі, васілёчкі...
Прабягуць дзянькі і ночкі.
Васілёчкі-васількі...
Ой, чаму ж не разам мы?

У салодкім сне згубіўся
І хацеў цябе шукаць...
Я бы мог пра ўсё забыцца
І каханую праспаць.

Прыпеў:

Васілёчкі, васілёчкі...
Пабудзіце, як званочкі.
Васілёчкі-васількі...
Каб не ведаў я бяды.

Я прачнуўся і заўважыў,
Як танцуюць матылькі.
Ты са мной, мая прапажа:
Вочы — быццам васількі.
Прыпеў:
Васілёчкі, васілёчкі —
Шчасця нашага сваточкі.
Васілёчкі-васількі...
Мы з табою назаўжды.

**Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН**

Азбука народнай культуры

**ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч**

АБРАД «Ад'езд жаніха». Падрыхтоўка жаніха перад ад'ездам да нявесты суправаджалася шматлікімі рытуальна-магічнымі дзеяннямі. Памыўшыся крынічнай вадой, прынесенай з вечара, жаніх адзяваўся ў падрыхтаванае да вяселля адзенне (звычайна гэта былі светлыя штаны і светлая кашуля з яркім арнаментам на грудзях і рукавах), падпярэзваўся шырокім поясам.

◈Раніцай у дом да жаніха запрашалі самых блізкіх сваякоў: цётак, дзядзькоў, хросных бацькоў, дружбантаў (шафераў). Жаніха садзілі на «пасад» — кораб з жытам. У гэты момант хросная маці або родная сястра жаніха тройчы выстрыгала яму на патыліцы крыжападобна некалькі валасоў. У некаторых рэгіёнах валасы не выстрыгалі, а абпальвалі на скронях грамнічнай свечкай (зноў-такі крыжападобна). Усе гэтыя дзеянні сімвалізавалі рытуальны пераход жаніха «з рабяцкага стану да ў мужчынскую славу» (параўнайце: рытуальны пострыг адбываецца ў храме ў час пасвячэння паслушніка ў манахі, а таксама ў момант хрышчэння).

◈Сваты і дружкі маладога збіралі «падарожную валізку» — своеасаблівы «абрус-самабор», які будзе самым цудоўным чынам дапамагаць пераадолець «нечаканыя» перашкоды на шляху вясельнага поезда і па дарозе да нявесты, і па дарозе дадому пасля вянчання. З сабой бралі некалькі пляшак гарэлкі, дамашняе печыва, мёд, грошы, закуску для тых, хто будзе «лавіць зайца» — перагароджваць дарогу маладым.

◈Далей бацькі ставілі ў цэнтры хаты стол, засцілалі яго белым абрусам, ставілі вядро з вадой і запальвалі грамнічную свечку. Бацька браў ручнік, перавязваў ім рукі сына, тройчы абводзіў яго вакол стала і вёў да парога. Затым даваў яму ў рукі невялікі абраз з выявай Хрыста, а маці, трымаючы ў руках грамнічную свечку і хатні абраз, бласлаўляла сына ў дарогу. Абраз пакідалі дома, а «грамніцу» сват браў з сабой, каб перасцерагчы вясельны поезд у дарозе. Затым гасцей запрашалі за стол, гучалі пажаданні, песні.

◈Усе разам выходзілі на вуліцу і садзіліся ў вазы: на першым сядзеў жаніх, хросныя бацькі, сваты, на наступным — сястра з елкай ці вясельным дрэўцам і хлебам-соллю, на астатнія вазы садзіліся сваякі і дружкі жаніха, музыкі. Картэж накіроўваўся да хаты нявесты.

На Беларусі меў месца і такі звычай, калі жаніх і нявеста ехалі ў царкву паасобку і да вянчання не сустракаліся. Такі «парадак» быў заведзены на вяселлях гарадской інтэлігенцыі каталіцкай канфесіі.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 5.35 | 20.55 | 15.20 |
| Віцебск | 5.19 | 20.49 | 15.30 |
| Магілёў | 5.25 | 20.45 | 15.20 |
| Гомель | 5.27 | 20.36 | 15.09 |
| Гродна | 5.51 | 21.09 | 15.18 |
| Брэст | 5.57 | 21.04 | 15.07 |

### Месяц

***Апошняя квадра 7 жніўня. Месяц у сузор'і Шаляў.***

### Імяніны

***Пр.*** *Ганны, Аляксандра, Макара.*
***К.*** *Дароты, Клаўдзіі, Кандрата.*

Фота Марыны ПЯТРОВІЧ.



## ЗАЎТРА




### ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +33..+35°C | КІЕЎ +29..+31°C | РЫГА +23..+25°C |
| ВІЛЬНЮС +29..+31°C | МАСКВА +32..+34°C | С.-ПЕЦЯРБУРГ +22..+24°C |

## УСМІХНЕМСЯ

**— Быў ва ўрача. Кажа, што больш за 100 грамаў піць нельга.**
**— А ты яшчэ да чатырох схадзі, дык паўлітра і набярэш!**

Напэўна, у кожнага быў такі момант, калі хацелася кінуць свой тэлефон аб сценку, але вось яго кошт заўсёды прымушаў кідаць прыладу толькі ў падушку!

**Парада хлопцам.**
**Падчас сексу ўкусі дзяўчыну за нос, пасля чаго дастань з-пад ложка вожыка і пакармі яго. Будзь непрадказальны і клапатлівы. Жанчыны такіх любяць.**




caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.022. Індэкс 63850. Зак. № 3044.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 7 жніўня 2015 года.